СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ і І ПАЎГОДДЗЕ 2011 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	месяц	І квартал	паўгоддзе
63850 (індывідуальны)	12400	37200	74400
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800	69600
63858 (ведамасны)	19900	59700	119400
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000	108000

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

17 ЛІСТАПАДА 2010 г.
СЕРАДА
№ 225
(26833)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Толькі факты

БЕЛАРУСЫ АДЗНАЧАЮЦЬ СПАКОЙНУЮ ПАЛІТЫЧНУЮ АБСТАНОЎКУ І ЭКАНАМІЧНУЮ СТАБІЛЬНАСЦЬ

Большасць беларусаў (60 працэнтаў) указваюць на спакойнае палітычнае становішча ў краіне. Такія вынікі апытання, праведзенага Інстытутам сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў кастрычніку.

Палова апытаных (50,5 працэнта) лічаць, што сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі ў бліжэйшы час палепшыцца ці не зменіцца. Чвэрць удзельнікаў апытання (26 працэнтаў) адзначае, што за апошні год матэрыяльнае становішча іх сем'яў палепшылася, у 42 працэнтаў яно засталося на тым жа ўзроўні.

Ул. інф.

Як Вы ацэньваеце палітычнае становішча ў рэспубліцы?
(у % ад колькасці апытаных)

Як, на Ваш погляд, можа змяніцца сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі ў бліжэйшы час?

Як змянілася матэрыяльнае становішча Вашай сям'і за апошні год?

ВЫ ШУКАЕЦЕ ПРАЦУ? ПРАЦА ШУКАЕ ВАС... НА КІРМАШЫ ВАКАНСІЙ

У ЧАРАШНІ «Кірмаш вакансій», які праходзіў у сталічным Палацы чыгуначнікаў, зноў пацвердзіў вялікі попыт на нізкакваліфікацыйныя спецыяльнасці. Не бракавала вакансій і для людзей з вышэйшай адукацыяй. Відавочна, што паранейшаму застаецца дэфіцыт кадраў на нізкааплатныя пасады, дзе заробак у месяц не перавышае 500-600 тысяч рублёў. Кірмаш праводзіцца двойчы на год, але інтарэс да яго ў жыхароў сталіцы не зніжаецца. Па наведніках няцяжка вызначыць, што ён найбольш цікавы сярэдняй узроставай катэгорыі насельніцтва сталіцы — 25-45 гадоў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАШ РЭЗЕРВ — ПАСЛУГІ

ПАВОДЛЕ звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, за студзень—верасень паказчык знешняга гандлю таварамі і паслугамі склаў 46,1 млрд доларaў, і ў тым ліку экспарт — 20,9 млрд, а імпарт 25,2 млрд доларaў. Такім чынам, мы атрымалі адмоўнае сальда ў памеры 4,3 млрд «умоўных адзінак». Прычым такі малюнак склаўся нягледзячы на станоўчую дынаміку знешнегандлёвай дзейнасці. Так, за сёлетнія студзень—верасень у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года Беларусь павялічыла экспарт на 18,6, а імпарт — на 18,3 працэнта.

За студзень—верасень гэтага года знешнегандлёвы абарот тавараў выйшаў на ўзровень 41 млрд доларaў: гэты паказчык на 17,1 працэнта перавысіў узровень аналагічнага перыяду мінулага года. Пры гэтым рост экспарту склаў 16,8, а імпарту — 17,3 працэнта. Ці не галоўная прычына вялікага адмоўнага сальда тут застаецца ранейшай — значная патрэба эканомікі Беларусі ў імпарце такіх «прамежкавых» тавараў як энерганосьбіты, сыравіна, матэрыялы і камплектуючыя. Да таго ж у нечым цяперашнюю сітуацыю можна назваць вынікам неспрыяльнай кан'юнктуры. Як адзначыла намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Ірына Кангро, істотны рост імпарту тлумачыцца як павелічэннем фізічных аб'ёмаў паставак, так і значным павышэннем кантрактных цэн — у параўнанні з мінулым годам цэны на імпартныя тавары ўзраслі на 12,7 працэнта.

Адначасова статыстыка адзначае: за студзень—верасень экспарт спажывецкіх тавараў перавысіў іх імпарт на 0,2 млрд доларaў, а станоўчае сальда гандлю прадуктамі харчавання склала 1,1 млрд доларaў. Сёлета мы сталі прадаваць за мяжу больш малочнай і мясной прадукцыі, цукру, халадзільнікаў, гадзіннікаў, тэлевізараў, матацыклаў, піва, цыгарэт. Прычым айчынныя вытворцы захоўваюць трывалае лідарства на ўнутраным рынку. Доля беларускіх тавараў у спажывецкім таваразвароце нашай краіны складае 77 працэнтаў. Крыху большы (83 працэнты) гэты паказчык па харчовых, крыху меншы (66 працэнтаў) па нехарчовых таварах.

Яшчэ адзін адметны момант — станоўчае сальда Беларусі ў гандлі паслугамі. За студзень—верасень мы экспартавалі паслуг амаль на 3,3 млрд, тады як імпартавалі — прыкладна на 2 млрд доларaў. Асноўнай крыніцай экспарту тут з'яўляюцца транспартныя паслугі. Дарэчы, заўважыла Ірына Кангро, на долю паслуг прыпадае каля 11 працэнтаў знешнегандлёвага абароту, і менавіта паслугі з'яўляюцца адным з рэзерваў для змяншэння адмоўнага знешнегандлёвага сальда ў цэлым. У прыватнасці, гаворка павінна ісці пра павелічэнне аб'ёмаў турыстычных, будаўнічых і тых жа транспартных паслуг.

Сяргей ГРЫБ.

ЦЭНЫ І АЛКАГАЛІЗАЦЫЯ ДЛЯ РАСІЯН БОЛЬШ АКТУАЛЬНЫЯ, ЧЫМ ДЭМАКРАТЫЯ І ТЭРАРЫЗМ

Суседзі

Пра гэта сведчыць праведзенае ў кастрычніку **Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі** апытанне. У рэйтынгу праблем па-ранейшаму лідзіруюць інфляцыя (56 працэнтаў) і алкагалізм (53 працэнты). Да найбольш важных пытанняў, якія стаяць перад Расіяй, рэспандэнты аднеслі і беспрацоўе (46 працэнтаў), карупцыю і бюракратызм (44 працэнты), а таксама ўзровень жыцця насельніцтва (42 працэнты).

Крыху меншую трывогу выклікае ў расіян сітуацыя ў жыллёва-камунальнай сферы (34 працэнты), сітуацыя з пенсійным забеспячэннем (33 працэнты), злачыннасцю (31 працэнт) і аховай здароўя (30 працэнтаў). Далей рэспандэнтамі згадваліся такія праблемы як становішча моладзі, тэрарызм (па 26 працэнтаў), стан маралі (23 працэнты), сітуацыя ў сферы адукацыі (19 працэнтаў), уплыў алігархаў на жыццё (19 працэнтаў), экалагічная, дэмаграфічная сітуацыя (па 16 працэнтаў), эканамічны крызіс (15 працэнтаў), затрымкі выплат заработнай платы (13 працэнтаў) і сітуацыя ў арміі (11 працэнтаў).

А найменшую заклапочанасць у расіян выклікаюць такія праблемы як дэмакратыя і правы чалавека, нацыянальная бяспека (па 8 працэнтаў), міжнацыянальныя і міжканфесійныя адносіны, адносіны з краінамі СНД, становішча Расіі ў свеце (па 7 працэнтаў), экстрэмізм і фашызм (5 працэнтаў). Для нашых суседзяў узрасло значэнне такіх праблем як карупцыя (рост з 41 да 44 працэнтаў), пенсійнае забеспячэнне (з 26 да 33 працэнтаў) і ахова здароўя (з 27 да 30 працэнтаў).

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

17 лістапада 2010 г. у 12.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца пасяджэнне пятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ДВАЙНОЕ ЗАБОЙСТВА Ў ЛІДЗЕ

14 лістапада ў 23 гадзіны пасля тушэння пажару ў кватэры дома па вуліцы Тухачэўскага ў Лідзе выяўлены з цялеснымі пашкоджаннямі трупы 72-гадовага гаспадара і яго непрацуючага сына 1961 года нараджэння.

У той жа дзень пракуратура раёна завяла крымінальную справу. У ходзе расследавання ўстаноўлена, што забойства пасля сумеснага ўжывання спіртных напояў здзейснілі мясцовыя жыхары Сяргей Р. 1987 г.н. і Аляксандр Д. 1991 г.н., непрацуючыя. Каб утаіць злачынства, яны падпалілі кватэру.

Абодвух падазроных затрымалі. Іх дачыненне да забойства пацвярджаецца неабвержнымі доказамі. Следства па справе праводзіць следчы па важнейшых справах абласной пракуратуры. Матывы і ўсе іншыя абставіны забойства высвятляюцца, паведаміў «Звяздзе» старшы памочнік пракурора Гродзенскай вобласці Вячаслаў Ігнацік.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ДВОЕ БЕЛАРУСАЎ АТРЫМАЛІ ЛЁГКІЯ ЦЯЛЕСНЫЯ ПАШКОДЖАННІ Ў ВЫНІКУ АВАРЫІ МІКРААЎТОБУСА Ў ЕГІПЦЕ

паведамілі ў прэс-службе МЗС Беларусі. «У медыцынскай установе горада Сафага пацярпелым аказалі медыцынскую дапамогу, пасля чаго абодва беларусы працягнулі свой адпачынак», — расказалі ў прэс-службе. ДТЗ адбылося 15 лістапада на трасе Хургада—Сафага. Мікрааўтобус, які рухаўся на вялікай хуткасці, перакуліўся з-за шыны, якая лопнула. Як паведамляюць замежныя інфармагенцтвы, у ім знаходзіліся 16 турыстаў — сямёра расіян, сямёра ўкраінцаў і двое беларусаў. Загінулі грамадзянка Расіі і грамадзянка Украіны.

БЕЛТА.

ХТО РОСЦІЦЬ І ЛОВІЦЬ, ТОЙ І КРАДЗЕ...

У рыбгасе «Сакалова» Маларыцкага раёна дзяржінспектары і міліцыянеры затрымалі чатырох работнікаў гэтай жа гаспадаркі.

Апошнія пры адлове рыбы з сажалак тайна загрузілі ў мяхі і на асабістых аўтамабілях спрабавалі вывезці 345 кілаграмаў карпа, таўсталобіка, белага амура і іншых відаў рыб.

На падобнае пайшлі і тры работнікі брыгады прамысловай лоўлі Нацыянальнага парку «Браслаўскія азёры» на возеры Дрывяты. Пры затрыманні ў парушальнікаў атрымалася схаваць скрадзены ўлоў у прыдарожнай лесапаласе і збегчы. Аднак рыбу знайшлі, а пры спробе яе вывезці затрымалі аднаго з раскрадальнікаў. Далей былі затрыманыя і іншыя. Канфіскавана 65 кілаграмаў рыбы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЖУДАСНАЕ ПАЛЯВАННЕ НА ЛЕБЕДЗЯЎ

Раніцай у мінулую суботу на вадасховішчы побач з вёскамі Новікі і Вялікае Гацішча Баранавіцкага раёна двое невядомых стралялі па лебедзях. Пра гэта стала вядома па словах відавочцы здарэння — жыхара горада Баранавічы, паведаміў рэдакцыі спецыяліст па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Руслан ШАЙКІН.

Крыху пазней работнікі Баранавіцкага РАУС адшукалі на месцы здарэння двух лебедзяў, адзін з якіх загінуў на месцы. Другую, параненую, птушку супрацоўнікі міліцыі перадалі ў ветлячэбніцу на абследаванне. Калі лебедзь выжыве, то далечвацца ён будзе ў жывым кутку на мясцовай мэблевай фабрыцы «Дыпрыз».

Не страляйце ў лебедзяў!

Вядомы эксперт АПБ па экалагічным заканадаўстве Рыгор Фёдараў лічыць, што калі гэтыя браканьеры будуць знойдзены, то ім неабходна будзе як мінімум кампенсаваць урон, нанесены прыродзе Беларусі, які складае па 10 базавых велічынь за кожную птушку.

Асобна зладзеяў павінны аштрафаваць за адміністрацыйнае правапарушэнне, упэўнены Руслан Шайкін. Фактаў у гэтай справе пакуль мала. Хутчэй за ўсё, гэта было не паляванне, а жудасная забава. Ёсць меркаванне, што невядомыя са стрэльбай былі не зусім цвярозымі і... не зусім адэкватнымі людзьмі.

Сяргей КУРКАЧ.

Ну і ну!

РЫБУ СКРАЛІ... МІЛІЦЫЯНЕРЫ

На вадаёме паблізу вёскі Любонічы Кіраўскага раёна работнікі Бабруйскай міжрайінспекцыі разам з супрацоўнікамі ААТ «Кіраўскае раённае дзяржаўнае прадпрыемства па вытворча-тэхнічным абслугоўванні і забеспячэнні аграпрамысловага комплексу», якое і арандуе гэты вадаём, за крадзеж рыбы затрымалі міліцыянераў.

Гэта былі супрацоўнікі Клічаўскага аддзела дэпартамента аховы МУС: два міліцыянеры-вадзіцелі і міліцыянер-кінолаг. Яны паспелі скрасці 50 кілаграмаў сажалкавай рыбы, якая была здадзеная на склад арандатара. На месца выклікаліся супрацоўнікі УУБ МУС, прадстаўнікі пракуратуры Кіраўскага раёна. У дачыненні да затрыманых дзяржінспектары склалі адміністрацыйныя пратаколы за дробны крадзеж.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

Форум

БУДУЕМ ДОМ: беражліва і з розумам

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

З 16 па 19 лістапада ў сталічным выставачным комплексе па праспекце Пераможцаў, 14 праходзіць 33-я міжнародная выстава жылля і будаўніцтва «Беларускі дом-2010», 16-я спецыялізаваная выстава «Ацяпленне. Водазабеспячэнне. Сантэхніка» і 3-я спецыялізаваная выстава «Трубатэх-2010». Сёлета пра ўдзел у форуме заявіла больш за 200 прадпрыемстваў з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Германіі, Швейцарыі. Напрыклад, тэматыка 33-й міжнароднай выставы «Беларускі дом—2010» у поўным аб'ёме прадстаўляе ўвесь спектр будаўнічай прадукцыі, якая будзе цікавай як спецыялісту, так і шэраговаму пакупніку. Тыя, хто распачалі будоўлю або толькі збіраюцца гэта зрабіць, змогуць знайсці на выставе практычна ўсё патрэбнае: ад архітэктурнага праекта да элітных матэрыялаў аздаблення, а таксама прадукцыю для добраўпарадкавання інтэр'ера. Усё гэта, вядома, можна знайсці і паасобку — у розных прадаўцоў з розных месцаў. Калі ёсць шмат часу. А форум дае магчымасць пабачыць усе прапановы пад адным дахам, параўнаць іх, выбраць аптымальныя цэны і, вядома ж, адшукаць навінкі. Як заўсёды, найперш за імі на выставу выправіліся і журналісты «Звязды».

СТАР. 3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПРЭЗІДЭНТ ЕС НАЗВАЎ УМОВУ РАСПАДУ ЕЎРАЗОНЫ

Еўразона не выжыве, калі не здолее пераадолець пазыковы крызіс, які закрануў у 2010 годзе цэлы шэраг краін — удзельніц валютнага саюза. Пра гэта заявіў прэзідэнт ЕС Херман Ван Ромпей, паведамляе AFP.

«Мы ўсе павінны працаваць для таго, каб еўразона выжыла, бо калі распадзецца еўразона, распадзецца і ўвесь Еўрасаюз, — заявіў кіраўнік ЕС. — Але я ўпэўнены, што мы пераможам гэта».

15 лістапада стала вядома, што Ірландыя вядзе перамовы пра атрыманне дапамогі ад ЕС і МВФ. Гэта адбылося праз паўгода пасля таго, як міжнародныя арганізацыі вылучылі больш за 100 мільярдаў еўра на выратаванне Грэцыі, якая апынулася ў пазыковым крызісе. Сама Грэцыя, у сваю чаргу, заяўляе, што можа затрымаць выплаты па дадзеных ёй крэдытах. Раней паведамлялася, што яшчэ адна краіна еўразоны — Партугалія — папярэдзіла пра высокую верагоднасць таго, што ёй таксама можа спатрэбіцца фінансавая дапамога. Нагадаем, у еўразону цяпер уваходзіць 16 дзяржаў ЕС, а 17-я — Эстонія — далучыцца да валютнага саюза з 1 студзеня 2011 года.

FORBES РАСПАВЁЎ ПРА ХОБІ МІЛЬЯРДЭРАЎ: ЯНЫ ЛЮБЯЦЬ ЗБІРАЦЬ ЖУКОЎ, РАМАНТАВАЦЬ ГАДЗІННІКІ І ПІСАЦЬ ОПЕРЫ

Дэвід РАКФЕЛЕР.

Мільярдэры захапляюцца не толькі яхтамі, скакунамі, антыкварыятам і супердарагімі аўтамабілямі — часам іх хобі падобнае на дзівацтва, сцвярджае часопіс Forbes.

Так, вядомы прадстаўнік клана Ракфелераў Дэвід калекцыянуе жукоў. Адпраўляючыся ў паездку, ён заўсёды трымае ў кішэні кантэйнер на той выпадак, калі яму сустрэнецца незвычайная казурка. У яго калекцыі ёсць і ўнікальны від жука-скарабея, абагаўлёнага егіпецкімі фараонамі. Адкрытаму Дэвідам жуку прысвоена нават імя Ракфелераў — Diplotaxis rockefelleri.

Незвычайнае хобі ў банкіра Клэмі Дайксана Спэнглера, якому, у прыватнасці, належыць важкі пакет акцый у Bank of America. Ён любіць бавіць вольны час, рамантуючы старыя гадзіннікі. Мільярдэр сцвярджае, што аддае перавагу кампаніі старадаўніх механічных гадзіннікаў перад людзьмі, такімі нясталымі і непрадказальнымі. Яго захапленне пачалося 45 гадоў таму, калі спыніўся гадзіннік XVII стагоддзя, падораны маці, і фінансіст вырашыў сам зазірнуць у таямніцы гадзіннікавага механізма. Пазней, калі дома не засталося ніякіх паламаных ходзікаў, мільярдэр для душы адкрыў майстэрню па рамонце старадаўніх гадзіннікаў.

Яго таварыш па цэху мільярдэраў Гордан Геці кінуў нафтавы бізнэс, каб засяродзіцца на... напісанні опер. Свой самы вядомы твор ён назваў у гонар шэкспіраўскага персанажа «Фальстаф». Мільярдэр ужо паставіў сваю оперу з Расійскім нацыянальным аркестрам.

БРЫТАНСКІ ПРЫНЦ УІЛЬЯМ АБВЯСЦІЎ ПРА ЖАНІЦЬБУ

Брытанскі прынц Уільям, унук каралевы Лізаветы II і старэйшы сын спадчынніка прастола прынца Чарльза, нарэшце вырашыў ажаніцца, перадае Reuters. Выбранніцай прынца стала яго 28-гадовая аднагодка Кэтрын Мідлтан, з якой ён падтрымлівае блізкія адносіны ўжо некалькі гадоў. Пра запланаванае вяселле паведаміў у аўторак Букінгемскі палац.

БРЫТАНСКАЯ МОЛАДЗЬ — НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ ПА ЎЖЫВАННІ КАКАІНУ

На першае месца сярод краін Захаду па колькасці маладых людзей, якія ўжываюць какаін, ва ўзроставай групе ад 15 да 34 гадоў выйшла Вялікабрытанія. Пра гэта паведаміла спецыялізаванае агенцтва Еўрасаюза — Еўрапейскі цэнтр маніторынгу наркотыкаў і нарказалежнасці.

Складзеная ім сумесна з Еўраполам справаздача распаўсюджаная ў чацвер у Лондане.

Паводле вынікаў аналізу сітуацыі з ужываннем наркотыкаў Вялікабрытанія выйшла ў 2009 годзе на першае месца сярод усіх заходніх краін па колькасці людзей, якія ўжываюць какаін. Іх колькасць дасягае 6,2% сярод насельніцтва ва ўзросце да 34 гадоў.

На другой пазіцыі — Іспанія, на трэцяй — ЗША. Затым ідуць Канада, Аўстралія, Данія, Ірландыя і Італія. Адначасова ў 2009 годзе ў Заходняй Еўропе адбылося скарачэнне ўжывання марыхуаны. Аднак праблема з гэтым наркотыкам абвастрылася ў краінах Усходняй Еўропы, у першую чаргу ў Чэхіі і Эстоніі.

Ліхаманку Дэнге завезлі з тайландскага курорта

Выпадак захворвання на ліхаманку Дэнге быў зарэгістраваны ў гэтым месяцы ў жыхара Магілёва, які вярнуўся ў Беларусь пасля адпачынку ў Тайландзе, на курорце Патайя.

Ліхаманка Дэнге распаўсюджана ў трапічных і субтрапічных краінах. Гэта вострае віруснае захворванне, якое працякае з ліхаманкавай інтаксікацыяй, болямі ў мышцах і суставах, сыпам, лімфаадэнапатыяй. Чалавек заражаецца праз укус інфіцыяванага камара. Па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, штогод ліхаманкай Дэнге заражаецца ў свеце больш як 50 мільёнаў чалавек, і каля 20 тысяч чалавек гінуць. У апошнія 10-15 гадоў захваральнасць расце. З пачатку 2010 года на тэрыторыі шэрагу краін (у Малайзіі, Бразіліі, Дамініканскай Рэспубліцы, Аргенціне, Судане, Калумбіі) рэгістраваліся ачагі ліхаманкі Дэнге. На тэрыторыі Расійскай Федэрацыі сёлета ў сакавіку—красавіку таксама былі зарэгістраваныя два выпадкі ліхаманкі Дэнге, якую жыхары Маскоўскай і Варонежскай абласцей «прывезлі» з адпачынку ў Тайландзе.

Пра эпідэміялагічную абстаноўку ў свеце па ліхаманцы Дэнге Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Рэспублікі Беларусь Алег Арнаутаў праінфармаваў Міністэрства спорту і турызму і папрасіў давесці гэтую інфармацыю да кіраўнікоў усіх турыстычных арганізацый.

Трэба мець на ўвазе, што захворванне ліхаманкай Дэнге пачынаецца востра: з дрыжыкаў, галавакружэння, млоснасці, моцнай патлівасці і павышэння тэмпературы цела да 40-41 градуса, якая трымаецца да чатырох дзён, затым крытычна зніжаецца да нормы, а праз 1-3 дні павышаецца зноў. Пры з'яўленні сімптомаў ліхаманкі на працягу 15 дзён пасля вяртання на радзіму неабходна неадкладна звярнуцца па дапамогу да ўрача. Самалячэнне можа пагоршыць стан хворага і прывесці да самых трагічных наступстваў. Пры адсутнасці пераносчыкаў інфекцыі (камароў) ліхаманка Дэнге не можа перадавацца ад чалавека да чалавека.

Надзея НІКАЛАЕВА.

МЕДЫКІ РАЯЦЬ ПРЫ ПАЕЗДКАХ У КРАІНЫ, НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ПА ЛІХАМАНЦЫ ДЭНГЕ, ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА НАСТУПНЫХ ПРАВІЛАЎ:

— выкарыстоўваць індывідуальныя сродкі аховы ад камароў: крэмы, мазі, гелі, якія адпужваюць насякомых;

— выкарыстоўваць сеткі на вокнах, дзвярных праёмах, над ложкамі, а падчас прагулак у трапічных лясах — маскітныя сеткі і адзенне, якое шчыльна прылягае да цела;

— апрацоўваць памяшканні інсектыцыдамі.

ЯРЕВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

26 ноября 2010 года

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка с кадастровым номером 224085304101000005 площадью 0,2480 га, расположенного по адресу: хутор Заготскот, ул. Полевая, д. 5 в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома, имеющего ограничения в использовании в связи с расположением в водоохранной зоне озера Задевское.

Начальная цена продажи 8 000 000 рублей.

Подробная информация о предмете аукциона была размещена в объявлении, опубликованном в номере газеты «Звязда» от 20.07.2010 года. Контактные телефоны комиссии по проведению аукциона: 8 (02155) 43 180, 41 132.

УНП 300085907

ГУ «НАЦИОНАЛЬНЫЙ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНЫЙ МУЗЕЙ-ЗАПОВЕДНИК «НЕСВИЖ»

(организатор аукциона, арендодатель)

проводит повторно открытый аукцион на право заключения на льготных условиях договора аренды кафе на 36 мест с подсобными помещениями площадью 207,5 кв. м, укомплектованного мебелью, инвентарем, кухонным и холодильным оборудованием, грузовым лифтом, охранной и пожарной сигнализацией, телефонной связью, расположенного по адресу: Минская область, г. Несвиж, Дворцово-парковый ансамбль с преимущественным правом аренды (при согласии сторон) точек общественного питания и гостиничного обслуживания, входящих во второй пусковой комплекс после ввода в эксплуатацию.

Начальная цена продажи права заключения договора аренды **1815625 бел. руб.**

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3632900000007 в филиал № 620 АСБ «Беларусбанк» г. Несвижа, МФО 153001523, ГУ «НИКМЗ «Несвиж», УНП 600207920.

Оплата стоимости права аренды производится в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона на р/с арендодателя.

Договор аренды подписывается сторонами в течение 5 рабочих дней после проведения аукциона и оформления протокола.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 22.12.2010 г. в 11.00 по адресу: г. Несвиж, ул. Ленинская-19.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 17.12.2010 г. до 16 часов по указанному адресу.

Тел.: (801770) 5 40 80, 5 57 91, м.т. 8029 569 64 13.

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 23.01.2010 г.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.11.2010 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▲ 1 долар ЗША	3 038,00	1 чэшская крона	167,85	USD	31,0560
▼ 1 еўра	4 131,07	1 польскі злоты	1049,78	10 UAH	39,0715
1 латвійскі лат	5 826,06	▼ 1 расійскі рубель	97,82	1000 BYR	10,2461
1 літоўскі літ	1 196,86	1 украінская грыўня	382,35	EUR	42,2175

Агенцтва Уладзіміра Грачова

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь узнагародзіў

...старшыню Венгерскай асацыяцыі беларусістаў прафесара Андраша Золтана медалём Францыска Скарыны. Адпаведны Указ Аляксандр Лукашэнка падпісаў 16 лістапада.

Такой высокай узнагароды Андраш Золтан удастоены за значны асабісты ўклад у папулярызацыю беларускай мовы і культуры ў Венгерскай Рэспубліцы, умацаванне беларуска-венгерскага супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы, плённую дзейнасць па ўзаемаабагачэнні нацыянальных культур.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Беларусь мае цвёрды намер прадаўжаць інтэнсіўны дыялог з Расіяй па вырашэнні праблем у Мытным саюзе

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю галоўнаму рэдактару расійскага часопіса «Свободная мысль» Уладзіславу Іназемцаву, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«Хочацца спадзявацца, што перспектывы ў Мытнага саюза ёсць. Мы маем цвёрды намер прадаўжаць інтэнсіўны дыялог з нашымі партнёрамі, перш за ўсё з Расіяй, па вырашэнні існуючых праблем. Ад таго, наколькі паспяхова мы пераадолеем цяжкасці станаўлення гэтага саюза, будзе залежаць яго прывабнасць і для іншых дзяржаў», — сказаў Прэзідэнт. «Што з гэтага атрымаецца? Пажывём — убачым».

Кіраўнік дзяржавы выказаў сваё бачанне будучыні Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, а таксама ў цэлым развіцця Беларусі, якая з'яўляецца своеасаблівым мостам паміж Расіяй і Еўрапейскім саюзам.

У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка лічыць, што матывы Беларусі і беларусаў пры выбудоўванні адносін з Расіяй за паўтара дзясятка гадоў не змяніліся. «Ад інтэграцыі мы чакаем у першую чаргу ўзаемнай выгады і ўзаемнай павагі да абодвух брацкіх народаў, суверэнітэту і нацыянальных інтарэсаў нашых дзяржаў. І тады вы можаце быць упэўнены, што больш надзейнага партнёра і адданага сябра, чым Беларусь і беларусы, у вас не будзе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы аб адносінах Беларусі і Еўрапейскага саюза, Прэзідэнт падкрэсліў, што сёння ЕС — адзін з асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі, другі пасля Расіі, а таксама крыніца перадавых тэхналогій і стандартаў, пастаўшчык высокадакладнага сучаснага абсталявання. «Гэта наш стратэгічны партнёр у барацьбе з новымі выклікамі і пагрозамі сучаснасці, якія маюць трансгранічны характар, — нелегальнай міграцыяй, гандлем людзьмі, кантрабандай наркотыкаў і ўзбраення, міжнародным тэрарызмам і распаўсюджваннем зброі масавага паражэння».

«Беларусь, па волі госпада, з'яўляецца сувязным мостам паміж Захадам і Усходам. Таму нават з-за геаграфічнага становішча прадвызначана шматвектарнасць нашай знешняй палітыкі і адкрытасць эканомікі», — дадаў Прэзідэнт.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне памочніку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Матвейчуку Уладзіміру Фёдаравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні памочніку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Матвейчуку Уладзіміру Фёдаравічу ў сувязі з напаткаўшым яго непапраўным горам — смерцю МАЦІ.

Рэдакцыя газеты «Звязда» смуткуе з выпадку смерці аднаго са старэйшых беларускіх журналістаў, былога галоўнага рэдактара «Сельской газеты» («Белорусская нива») Андрэя Данілавіча КОЛАСА і выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

Дзённік дзіцячага «Еўрабачання»

Літовец Бартас і яго група падтрымкі.

Юныя спявачкі з Галандыі Анна і Сенна: «У Мінску адчуваем сябе ўтульна».

Гасціннасць. Made in Belarus

«We love Belarus!!!» — кажа ўдзельнік з Літвы і дадае: «Усё будзе OKI-DOKI». Удзельнікі дзіцячага «Еўрабачання» здзіўляюць не толькі сваёй рознабаковасцю і шчырасцю, але і разнастайнасцю моў. Руская, англійская, фламандская, літоўская...

— Мы адчуваем сябе тут вельмі ўтульна, — прызнаюцца дзяўчынкі з Нідэрландаў **Анна і Сенна**. — Усе з намі вельмі прыветлівыя, і горад нам вельмі спадабаўся, ён вельмі прыгожы і чысты. Нам спадабаліся песні ўсіх краін, але больш за ўсё — песні Мальты і Бельгіі. Запомніўся і беларускі канкурсант — ён спявае вельмі прыгожа. Перад нашым ад'ездам Ральф Макенбах (леташні пераможца дзіцячага «Еўрабачання» — **Аўт.**) даў нам вельмі шмат настаўленняў і пажаданняў. Мы павінны трымаць сябе вельмі добра на сцэне і дарыць навакольным радасць. Мы зробім усё магчымае, каб перамагчы, але калі не пераможам, не будзем засмучацца.

Жыццё ў «Мінск-Арэне» кіпіць. Тэхнікі даводзяць апошнія штрыхі сцэны, арганізатары сочаць, каб усё адбывалася паводле плана, а ў юных спевакоў учора прайшлі першыя рэпетыцыі.

Графік вельмі шчыльны. У 09:20 — выступленне першага канкурсанта, у 19:45 — апошняга. На прагон нумара адведзена 35 хвілін. Парадак выступленняў на рэпетыцыі ідзе ў той жа паслядоўнасці, як будзе праходзіць і ў фінале. Адкрые песеннае спаборніцтва спявак Бартас (Ноюс БАРТАШКА). 14-гадовы літовец выканае песню «OKI-DOKI». Закрываць конкурсную праграму будзе пяцікласніца з Македоніі Аня ВЕЦЕРАВА з песняй «EOO, EOO».

— Пакуль у нас усё ідзе цудоўна, — расказаў «Звяздзе» **выканаўчы прадзюсар дзіцячага «Еўрабачання-2010» Аляксандр МАРТЫНЕНКА**. — Я спадзяюся, калі ўсе дні пройдуць так паспяхова як сёння, нашы госці застануцца задаволенымі. Дзеці познаёміліся, адпачылі, у іх пачаліся працоўныя будні. Але акрамя рэпетыцый, канкурсантаў чакаюць экскурсіі па Мінску, наведванне еўраклуба, яны абавязкова сходзяць у цырк. Так што будзе не толькі шмат працоўных момантаў, але і час для адпачынку.

Напярэдадні рэпетыцый у еўрадоме дзеці мелі магчымасць больш цесна пазнаёміцца.

— У Мінску мы літаральна пару дзён, а ўжо атрымалі столькі пазітыву, што проста не нарадаць словамі! — дзеляцца ўражаннямі **канкурсанты з Расіі, пяцікласнікі Ліза ДРОЗД і Саша ЛАЗІН**. — Усе вельмі гасцінныя і прыветлівыя. Мы чулі, што ў Беларусі вывучаецца беларуская мова, што тут дзве дзяржаўныя мовы, і, магчыма, мясцовыя хлопчыкі і дзяўчынкі навучаць нас размаўляць па-беларуску.

На конкурсе мы хочам не толькі паказаць сябе, але і завесці шмат сяброў. Перад ад'ездам леташняя ўдзельніца ад Расіі Каця РАБАВА пажадала нам удачы. Што патрэбна для перамогі? Удача, велізарная праца, пазітыўныя эмоцыі і проста расслабленне. Чаго і зычым усім удзельнікам!

Ілья ЛАПАТО.
Фота Вольгі ЛАСКІ.

КРАЎ У ХВОРЫХ...

У Мінску затрыманы злодзей, які з бальнічнай палаты «прыхватызаваў» рэчы пацыентаў.

Заявіўся ж 23-гадовы мінчанін у адну з бальніц пад выглядам наведвальніка сваяка, хоць насамрэч ніхто з яго родных там на лячэнні не знаходзіўся. Паводле звестак прэс-афіцэра Маскоўскага РУУС Таццяны Грыб, зламыснік абыходзіў палаты, спадзеючыся на ўдачу, і калі ўбачыў, што ў адной з іх нікога не было, хуценька завалодаў чужымі ноўтбукам, мабільным тэлефонам і лекамі. Між іншым, усё крадзенае злодзей паспрабаваў прадаць на вуліцы, аднак не знайшоў тут пакупнікоў і «загнаў» рэчы па таннай цане на рынку. Калі яго затрымалі, то высветлілася, што падазроны мае дачыненне да крадзяжу з аднаго са сталічных офісаў, дзе ён завалодаў мабільнікам. Мяркуецца таксама, што гэта не адзіны падобны крадзеж затрыманага: цяпер вядзецца праверка, ці не «запэцкаўся» ён у іншых падобных злачынствах. Дарэчы, раней хлопец ужо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці, ён мае судзімасці за крадзяжы і захоўванне наркотыкаў.

Ігар ГРЫШЫН.

МУСУЛЬМАНЕ АДЗНАЧАЮЦЬ КУРБАН-БАЙРАМ



Мусульмане ўсяго свету 16—18 лістапада адзначаюць важнейшае рэлігійнае свята — Ід аль-Адха (свята ахвярапрынашэнняў), або, як называецца гэты дзень у цюркскіх мовах, Курбан-байрам.

Гэтымі днямі спраўляюцца рытуалы ахвярапрынашэння (курбан), узносяцца святочныя малітвы. Святкаванне Курбан-байрама завяршае шматлікі хадж (паломніцтва) мусульман усяго свету да святынь у Мецы і Медыне. Кульмінацыяй хаджу з'яўляецца так званае стаянне на гары Арафат: тут, за 20 км ад Мекі, паводле ісламскага падання, сустрэліся Адам і Ева. Менавіта адсюль Мухамед сказаў сваю апошнюю пропаведзь. Пасля стаяння, якое доўжыцца да заходу сонца, пачынаецца абрад сімвалічнага біцця сатаны камянямі ў даліне Міна. Вернікі кідаюць камяні ў слупы, сімвалізуючыя дэманаў, што стаяць у даліне.

Згодна з Каранам, Алах з'явіўся да Аўраама ў сне і загадаў яму прынесці ў ахвяру свайго першынца Ісмаіла. Аўраам адправіўся ў даліну Міна да таго месца, дзе цяпер стаіць Мека, і пачаў падрыхтоўку. Але Бог, убачыўшы рашучасць прарока, злітаваўся, і замест Ісмаіла ў ахвяру было прынесена ягня.

Свята, такім чынам, нагадвае аб літасці Усявышняга і аб тым, што вернасць Богу — самая лепшая ахвяра.

Абзац

Споўнілася 105 гадоў з дня нараджэння пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Яна Скрыгана. Нарадзіўся на Капыльшчыне, быў рэпрэсаваны, правёў удалечыні ад роднага краю 18 гадоў. Пасля рэабілітацыі працаваў на розных пасадах у літаратурным, выдавецкім асяродку, выдаў некалькі кніг прозы, шмат перакладаў. Памёр у 1992 г.

У Іванцэвіцкім раёне ў выніку наезду мікрааўтобуса загінула 48-гадовая расіянка. 32-гадовы жыхар Мінска, які позна ўвечары ехаў на аўтамабілі «Мерседэс-Бенц 410» у бок сталіцы, учыніў наезд на жанчыну, калі тая перабягала праезную частку. Яна памерла на месцы. Кіроўца спыніўся і патэлефанаваў у міліцыю. Супрацоўнікі ДАІ, якія прыбылі на месца аварыі, знайшлі ў жанчыны ключы ад аўтамабіля. За 800 метраў ад месца здарэння была знойдзена «Мазда» з расійскімі нумарамі. У аўтамабілі знаходзіліся дакументы загінулай. Устаноўлена, што гэта грамадзянка Расіі, жыла ва Уладзівастоку. 15 лістапада яна прыехала ў Беларусь з Украіны. Па факце аварыі распачата крымінальная справа.

Жыхарка адной з вёсак Пінскага раёна падазраецца ў прычыненні цяжкага цялеснага пашкоджання свайму двухмесячнаму сыну. У дачыненні да 29-гадовай жанчыны пракуратурай распачата справа аб наўмысным прычыненні цяжкага цялеснага пашкоджання заведама малалетняй асобе. Свае дзеянні яна тлумачыць тым, што не магла супакоіць немаўля, якое моцна плакала, і ўдарыла яго рукой. У хлопчыка — разрыў селязёнкі, яму зроблена аперацыя.

Поўны абзац

У Екацярынбургу (Расія) ДІБДР шукае зламыснікаў, якія намалявалі на зялёным сігнале святлафора каноплі. Невядомыя з дапамогай трафарэту нанеслі выяву забароненай «траўкі» на святлафорах васьмі скрыжаванняў паблізу бальніц і буйных забаўляльных цэнтраў. Аўтааматары збянтэжаныя: ну і жартачкі ў даішнікаў! У абласную адміністрацыю пасыпаліся скаргі шакіраваных гараджан. Галава даў каманду знайсці і пакараць гора-мастакоў. Аўтаінспектары другі дзень чысцяць прыборы: жартаўнікі не пашкадавалі грошай на фарбу, купілі самую трывалую. За такія жартачкі пагражае буйны штраф — за прапаганду наркотыкаў.

У індыйскім горадзе Дуле ўрач адной з мясцовых бальніц выдаліў з ныркі пацыента 172 тыс. 155 камянёў. Аперацыю па іх выдаленні ў 43-гадовага мужчыны, які на працягу паўгода мучыўся ад моцнага болю ў жываце, правёў хірург у канцы мінулага года. Камяні дыяметрам ад 1 мм да 2,5 см складаліся са шчаўевакіслага кальцыю і фасфату кальцыю. Палічыць камяні доктару дапамог чалавек, які спецыялізуецца на працы з дыяментамі. На гэта яны трацілі па тры гадзіны ў дзень на працягу месяца. Пасля працяглых праверак выявілася, што ўрач стаў абсалютным рэкардсменам у гэтым кірунку, днямі яму прыслалі пасведчанне Кнігі рэкордаў Гінэса.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

«ВЫКРАЎ» СВАЁ АЎТО

Каб пазбегнуць адказнасці за ўчыненае ДТЗ, мінчанін прыдумаў гісторыю пра напад...

42-гадовы мужчына, паводле звестак прэс-афіцэра Мінскага РУУС Наталлі Свідуновіч, прыйшоў у Мачулішчанскі аддзел міліцыі і распавёў праваахоўнікам пра тое, што невядомыя выкралі ў яго аўтамабіль. Паводле слоў заяўніка, ён падабраў на дарозе паблізу вёскі Ураджайнае двух хлопцаў, якія галасавалі на дарозе, а тыя, на яго бяду, аказаліся злачынцамі. У прыватнасці, паведаміў мужчына, у дарозе пасажыры пачулі нейкі незразумелы стук у машыне і параілі кіроўцу спыніцца. А ён, маўляў, прыслухаўся да парады, выйшаў з аўто і... адчуў, што па галаве нечым ударылі. Калі ж прыйшоў у прытомнасць, то ўбачыў, што аўтамабіль знік. Толькі, як высветлілася, усю вышэйзгаданую гісторыю «пацярпелы» выклаў з адной мэтай — спрабаваў пазбегнуць адказнасці за дарожна-транспартнае здарэнне, якое ўчыніў у сталіцы. Акрамя таго, у момант учынення ДТЗ і падчас візіту ў міліцыю мужчына быў нецвярозым: у яго крыві было знойдзена два праміле алкаголю. Між іншым, у 2005 годзе ён ужо пазбаўляўся права кіравання транспартным сродкам тэрмінам на 5 гадоў за кіраванне ў стане алкагольнага ап'янення. На гэты раз у адносінах да «казачніка» заведзеная крымінальная справа за заведама несапраўдны данос.

Ігар ГРЫШЫН.

20 лістапада 2010 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «Міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2010» у Мінску».

НЕВЯДОМЫ БЕЛАСТОК

На свае вочы

Гэты горад, як і Рым, размешчаны на сямі пагорках

Зчым асацыіруецца ў нашай краіне, і асабліва для жыхароў беларуска-польскага памежжа, горад Беласток? Па-першае, вядома ж, з візамі і пагранпераходамі, мытнямі, дзе здараецца, можна надоўга «прытармазіць» у чэргах . А па-другое, з так званым «шопінгам» і, адпаведна, з цэнамі на тыя ці іншыя тавары, умовамі і нормамі іх увозу. На жаль, гэтым пакуль і абмяжоўваюцца нашы «турыстычныя» інтарэсы ў суседнім горадзе. Вось і атрымліваецца, што мы практычна не ведаем, а чым жа ён цікавы, акрамя шматлікіх, велізарных і не надта гандлёвых устаноў? Хоць Беласток прывабны не толькі імі.
Вось толькі некаторыя штрыхі да яго аблічча.



ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

Першае ўпамінанне пра Беласток у пісьмовых крыніцах датуецца 1514 годам. Аднак яго гісторыя, паводле легенды, пачынаецца значна раней, у 1320 годзе, калі літоўскі князь Гедымін паляваў у пушчы на тура. Адпачываючы пасля пагоні ля ляснога ручая, ён сказаў: «Чысты, белы сток. Тут можна пабудаваць паляўнічы двор альбо нават заснаваць вёску. «Сток» — гэта даўняя назва ручая, які цячэ і сёння ў выглядзе рэчкі Белая. У 1692 годзе Беласток атрымлівае гарадскія правы, а ў 1749 годзе яму прадастаўляецца магдэбургскае права.

Супараўнальны з Гроднам па колькасці жыхароў амаль 300-тысячны Беласток — буйнейшы горад паўднёва-ўсходняй Польшчы, сталіца Падляскага ваяводства, дзе здаўна пражываюць палякі, беларусы, яўрэі, літоўцы, немцы, рускія, татары, людзі рымска-каталіцкага, праваслаўнага (каля 25 працэнтаў жыхароў), іўдзейскага, пратэстанцкага і ісламскага веравызнанняў. Гэтыя рэаліі, верагодна, і паўплывалі на тое, што тутэйшы ўраджэнец Людвік Заменгоф пачаў працу над стварэннем універсальнай міжнароднай мовы — эсперанта. Не выпадкова цяпер менавіта ў Беластоку праводзяцца сусветныя кангрэсы эсперантыстаў. Заменгофу ўстаноўлены помнік, з яго жыццёвым шляхам знаёміць музей, а справу доктара Эсперанта працягвае цэнтр даследаванняў праблем моўнай камунікацыі.

Знакавай для Беластока з'яўляецца, вядома, і асоба вялікага гетмана, мецэната мастацтва і навукі Яна Клеменса Браніцкага. Дзякуючы яму ў горадзе пабудавалі бальніцу, цэйхгаўз (збройевы склад), ратушу, пошту, тэатральны будынак, манастыр Сясцёр міласэрнасці ... А галоўнай архітэктурнай жамчужынай сталіцы Падляся па сёння з'яўляецца палац Браніцкіх, які ўжо з XVIII стагоддзя сталі называць «польскім Версалем», паколькі сваёй раскошай магнацкая рэзідэнцыя працягвае традыцыі барочных палацаў французскіх каралёў.

Дарэчы, у сённяшнім палацавам садзе, нягледзячы на значна меншую ў параўнанні з першапачатковай плошчу, і цяпер шмат слядоў археалагічнай старажытнай кампазіцыі, дзякуючы чаму ён лічыцца адным з найлепш захаваных у Польшчы барочных садоў. Увогуле ж зялёныя насаджэнні займаюць прыкладна трэцюю частку тэрыторыі горада: тут ажно восем паркаў і два запаведнікі. Пры гэтым ствараюцца спрыяльныя ўмовы і для прагулак пехатой, і для аматараў аздараўленчага бегу, веласіпедыстаў. Ёсць таксама схілы для спуску на лыжах і санях, а той, каго цягне ў неба, можа скарыстацца паслугамі аэрапорта Крыўляны для заняткаў авіяцыйным, дэльталётным і паветраплавальным спортам.

Зрэшты, вернемся да гістарычных аб'ектаў, якіх у Беластоку некалькі соцень, у тым ліку каля 150 унесеных у рэестр помнікаў. Цікава, што заснаваная каля 1745 года гетманам Янам Клеменсам Браніцкім беластоцкая ратуша з самага пачатку служыла не для пасяджэнняў членаў магістрата, а выконвала... гандлёвую функцыю. У чатырох вуглавых эркерах знаходзіліся купецкія крамкі. А паколькі вакол Ратушы знаходзіўся рынак, Браніцкі загадаў пабудаваць побач гарадскія вагі. Тады і ўзнік мураваны аднапавярховы будынак з аркамі, дзе размясцілі пазначаныя членамі магістрата ўзоры мер аб'ёму і даўжыні. У сярэдзіне XIX стагоддзя ратушная вежа, якая дамінавала над усім горадам, служыла ў якасці пажарнай каланчы. А ў 1939 годзе, калі прыйшла савецкая ўлада, гістарычную пабудову знеслі, а на яе месцы хацелі паставіць помнік Сталіну, ды не паспелі — вайна...

Адначасова ратушу пачалі ў 1954 годзе. Зараз, праўда, яна ўжо не мае ранейшага гандлёвага прызначэння, ды і гарадскія вагі вярнуць было немагчыма. Затое там цяпер Падляскі музей з археалагічнымі, этнаграфічнымі калекцыямі, а таксама выдатнай галерэяй польскага жывапісу за перыяд з канца XVIII да пачатку XX стагоддзя.

Працягваем прагулку па гістарычным цэнтры Беластока. Непадалёк, на вуліцы Ліпавай, размешчаны праваслаўны кафедральны сабор св. Мікалая Цудатворца, пабудаваны ў 1843—1846 гадах на месцы старажытнай царквы. У саборы знаходзяцца мошчы падляскага святога пакутніка Гаўрыіла Заблудоўскага і цудатворная ікона Беластоцкай Божай Маці.

У беластоцкім раёне Дайліды знаходзіцца адзін з чатырох у Польшчы жаночых праваслаўных манастыроў. А прадоўжым мы падарожжа па буйнейшым цэнтры праваслаў'я ў гэтай краіне ў наваколлі горада. Напрыклад, у населеным пункце Беласточак, у старой драўлянай сядзібе сабраныя старажытныя, тыповыя для тутэйшых мясцін музычныя інструменты. У вёсках Козлікі, Рыбалы, Цялушкі і Паўлы зачароўваюць маленькія шматколерныя драўляныя цэрквы. А крыху далей, у вёсках Соцы, Пухлы і Трасцянка, акрамя царквы і капліч кі, можна ўбачыць так званую Краіну Адчыненых Аканіц. Адметнасць гэтых унікальных па архітэктуры вёсак — у багатых разных упрыгажэннях драўляных дамоў — і на фасадах, і на вуглах, вокнах.

Дарэчы, па гэтай тэрыторыі праходзіць унікальны падляскі бусліны маршрут, які спалучае нацыянальныя паркі ваяводства: Белавежскі, Наравянскі, Бебжанскі і Вігерскі. Прыкладна за трыццаць кіламетраў ад Беластока знаходзіцца еўрапейская бусліная вёска — Пентава. Тут налічваецца больш за дваццаць бусліных гняздоўяў і ўстаноўлены вежы для назірання за птушкамі. А непадалёк, у Кермусах — так званыя мясціны «зубра і шляхецкіх традыцый», з музеем-запаведнікам, алеяй дубоў, умацаваным замкам. І, зразумела, старапольскай карчмой.

Рэцэпт бульбяной кішкі па-падляску

Інгрэдыенты:

500 грамаў свіной кішкі (лепш за ўсё тонкай), 3 кілаграмы бульбы, 200 грамаў вэнджанай грудзінкі, адна цыбуліна, каля шклянкі мукі, адно яйка, тлушч для бляхі.

Выраб:

Кішку акуратна абмыць з невялікай колькасцю солі. Цыбулю і парэзаную грудзінку засмажыць на патэльні. Да пачышчанай бульбы дадаць палову грудзінкі з цыбуляй, муку, яйка, прыправіць соллю і перцам на смак. Напоўніць кішку масай, пакласці на памазаны тлушчам бляху. Пракалоць кішку зубачысткай (прыблізна праз кожныя 5 сантыметраў). Запякаць у духоўцы каля адной гадзіны пры тэмпературы 150 градусаў.

...Крыху далей ад Кермусаў на поўдзень — і мы ў заснаваным у XI стагоддзі Суражы ля дзікай рэчкі Нарэў. Вельмі каштоўны гістарычны помнік у гэтым мястэчку, які называюць польскай Амазоніяй — Замкавая гара (гара каралевы Боны), дзе ў раннім сярэднявеччы быў умацаваны горад, а потым замак каралевы. Можна быццам вярнуцца ў тыя часы, наведаўшы славянскі пасёлак «Навія» з яго крамкамі і «майстар-класам» па вырабе дзёгцю, вайсковай амуніцыі і іншых рэчаў. А потым пабываць у заснаваным яшчэ перад Другой сусветнай вайной мясцовым земляробам Уладзіславам Літвінчуком грамадскім археалагічным музеі, якім цяпер кіруе ягоны сын Віктар.

Побач з Беластокам, у Асовічах, турыстам прапануюць убачыць, як выглядалі тутэйшыя вёскі ў сярэдзіне XIX стагоддзя. На тэрыторыі 27 гектараў размешчаныя дзясяткі разнастайных драўляных аб'ектаў — старыя хаты, сядзібы, рыгі, ветраныя млыны, свіраны, манежы...

Знаходзячыся на Беласточчыне, варта наведаць і мясціны, звязаныя з яўрэйскай культурай і традыцыямі (36 аб'ектаў яўрэйскай спадчыны), а таксама пабываць у Крынках. Гэта мястэчка з тыпова падляскім выглядам з рынку — на царкву, касцёл і сінагогу. Толькі тут у Польшчы можна ўбачыць круглую плошчу з адыходзячымі ад яе дванаццаць (!) вуліцамі. Другая такая ў Еўропе, больш позняя, знаходзіцца ў Парыжы на плошчы дэ ля Канкорд.

У дзесяці кіламетрах ад Крынак размешчаны населены пункт Горка, які першапачаткова належаў татарскай сям'і Мурзы Кшачкоўскага. Кажуць, што ў бітве пад Парканамі ён выратаваў жыццё каралю Яну Трэцяму Сабескаму і кароль наведаў яго па шляху на Сейм у Гродне. Дарэчы, бліжэй да мяжы з Беларуссю знаходзіцца вёска Крушыняны, якую некалі называлі «трохсвяточнай». У пятніцу святкавалі мусульмане — татары, у суботу — яўрэі, у нядзелю — каталікі і праваслаўныя.

... Цяпер у Беластоку праходзіць грамадскае абмеркаванне «Стратэгіі развіцця горада на перыяд 2011 — 2020 гадоў». Наперадзе новыя праекты. Але што застаецца нязменным, дык гэта добразычлівасць жыхароў Беласточчыны, у чым ужо неаднойчы пераконваўся і аўтар гэтых радкоў. Прычым, што прыемна, у шэрагу выпадкаў для мясцовых жыхароў была зусім не чужой беларуская мова. Нічога дзіўнага, бо менавіта Беласточчына з'яўляецца галоўным цэнтрам польскіх грамадзян беларускай нацыянальнасці.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

г. ВИТЕБСК 02.12.2010

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи лота, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Не завершенное строительством не законсервированное капитальное строение (здание банно-прачечного комбината), расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, Фариновский с/с, д. Фариново, д.14Б	Характеристика объекта: дата начала строительства: 1990 г.; площадь застройки – 950,45 кв. м, общая площадь – 796,8 кв. м, строительный объем – 3846,7 кв. м; общий процент готовности: 57,20%; фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия – ж/б плиты, кровля частично рулонная, частично шифер, полы – бетонная стяжка. Земельный участок: для обслуживания здания банно-прачечного комбината с кадастровым номером 223885709101000084, площадью 0,1949 га. Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне реки Ушача (площадью – 0,1949 га). Использование земельного участка для размещения: объектов административного назначения; объектов финансового назначения; объектов розничной торговли; объектов общественного питания; объектов гостиничного назначения; объектов физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения; объектов культурно-просветительного и зрелищного назначения; объектов бытового обслуживания населения.	35 000	35 000
2.	Не завершенный строительством объект – завод глиняного кирпича, расположенный по адресу: Витебская область, Чашникский район, Лукомльский с/с, северо-западнее д. Стражевичи	Характеристика объекта недвижимости: не завершенный строительством объект – завод глиняного кирпича. Земельный участок: с кадастровым номером 225183012101000094, площадь 26,3065 га для использования под производственную базу. Назначение – для использования под производственную базу.	35 000	35 000

ОРГАНИЗАТОР – фонд "Витебскоблимущество", г. Витебск, ул. "Правды", 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail: fondvitebsk @tut.by.

ПРОДАВЕЦ: по лоту № 1 – Производственное республиканское унитарное предприятие "Новополоцкжелезобетон", контактные телефоны в г. Новополоцке: (0214) 532801, 579155, 550404, по лоту № 2 – Дирекция строящегося государственного предприятия "Завод глиняного кирпича", контактные телефоны: (02133) 31333, 37637.

Условия продажи недвижимости:

по лоту № 1 – заключение победителем аукциона договора аренды земельного участка с исполкомом и осуществление государственной регистрации права на земельный участок в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

по лоту № 2 – осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте, создание им дополнительных рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи.

Аукцион состоится "02" декабря 2010 г. в 15 часов в здании фонда "Витебскоблимущество" по адресу: г. Витебск, ул. "Правды", 38.

1. Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом "Витебскоблимущество".

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 01.12.2010 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. "Правды", 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников **02.12.2010 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на **расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО "БПС-Банк" по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд "Витебскоблимущество", УНП 300002495.**

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11.03.2010 № 342. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 3 миллионов рублей (по каждому лоту); не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

ІМПЕРАТАР РАЗБУРЫЎ, А МЫ АДБУДУЕМ?..

Старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр Палышанкоў правёў экскурсію для журналістаў па будучыні Брэста

БРЭСЦКІ мэр Аляксандр Палышанкоў запрасіў журналістаў на прэс-канферэнцыю і правёў яе каля стэндаў з эскізамі будучых атэляў, гандлёвых цэнтраў, жылых забудоў, мастоў і іншых аб'ектаў, якія пакуль што існуюць толькі ў чарцяжах праекціроўшчыкаў. Кіраўнік гарадской улады пераходзіў ад аднаго стэнда да другога, знаёміў са зместам карцінкі, расказваў пра планы яе правядзення ў жыццё, пра інвестараў і іншыя крыніцы фінансавання. Некаторыя праекты выглядалі вельмі цікава.

МАСТЫ

Масты — гэта ці не праблема №1 у Брэсце. Заторы на дарогах, якія ўтвараюцца кожны дзень у гадзіну «пік», сталі вынікам у тым ліку і недахопу мастоў праз Мухавец. Новыя пуцеправоды для сувязі зарэчнай часткі горада з цэнтрам проста неабходныя. Больш за тое, мы даведаліся, што плануецца ўзвядзенне так званага Заходняга аб'езда ад «Варшаўскага моста» на вуліцу Зубачова, затым на вуліцу Смірнова. Будаўніцтва на гэтым шляху двух мастоў будзе прафінансаванае Міністэрствам транспарту і камунікацый, спадзяюцца ў гарвыканкаме. А жыхары паўднёвай часткі горада вельмі чакаюць гэтых мастоў, бо дабрацца зараз на працу як сваім, так і грамадскім транспартам выходзіць удвая даўжэй, чым было яшчэ гады два-тры таму.

А яшчэ мэр паведаміў, што будзе адноўлены мост праз Буг да польскага Цярэспаля. Тады суседзі змогуць прыйсці да нас (мост стане пешаходным) наведаць нашы гандлёвыя цэнтры, паплаваць у нашых басейнах, пазаймацца ў трэнажорных і іншых спартыўных залах. І мы, значыць, атрымаем магчымасць наведаць Польшчу без памежных чэргаў.

СПОРТ І ТУРЫЗМ

Калі чакаем гасцей і робім стаўку на турызм, то відавочна, павінны развіваць спартыўную базу і далей, хоць Брэст у гэтым сэнсе і без таго напярэдсе іншых абласных цэнтраў. Зусім хутка ў горадзе з'явіцца адкрыты штучны лёд. Ён будзе залиты паміж палацамі спорту — лядовым і водных відаў. Інвестар з Германіі ўкладвае ў абсталяванне каля 500 000 еўра. Запланавана мадэрнізацыя фізкультурна-аздараўляльнага комплексу ў мікрараёне «Усход». На гэты конт ёсць прапанова брэсцкіх архітэктараў і іх літоўскіх калег. Ёсць вялікая верагоднасць, што ў старых сценах з'явіцца аквапарк, боўлінг, а таксама рэабілітацыйны цэнтр для інвалідаў. У гарадской улады ёсць намеры мадэрнізацыі школьных стадыёнаў, каб на іх маглі займацца не толькі школьнікі, але і жыхары бліжэйшых кварталаў. Пакуль у праекце тры такія спартыўныя міні-цэнтры, далей — будзе болей.

У Брэсце не хапае гасцініц. І ў гэтым кірунку патрэбна працаваць. Будаўніцтва атэляў плануецца па вуліцах Чырванасцяжнай, Савецкай, на рагу вуліц Гогаля і Фаміна, магчыма, на вуліцы Ленінградскай. А на Савецкай плануецца ўзвядзенне пяцізоркавага атэля з удзелам чэшскага капіталу.

ЖЫЛЛЁ

Аляксандр Палышанкоў на пытанне пра жыллёвае будаўніцтва найперш прывёў такія лічбы: на пачатак бягучай пяцігодкі ў абласным цэнтры была 17-гадовая чарга на атрыманне жылля, цяпер тэрмін чакання скараціўся да 7-8 гадоў, а за наступныя пяць гадоў чарга павінна мець адрэзак чакання ў тры гады. Пяць гадоў таму ў Брэсце было 6400000 квадратных метраў жылля. За ўказаны час мы прыраслі на 20 адсоткаў, а ў наступныя пяць гадоў запланавана пабудаваць яшчэ больш. Плануецца асвоіць новы сучасны метад будаўніцтва — гэта так званая няздымная апалубка. Такая тэхналогія дазволіць узводзіць якасны 60-кватэрны жылы дом за пяць тыдняў.

Ужо налета пачнецца забудова старога раёна Трышына ўздоўж вуліцы Маскоўскай. Мінская кампанія «КМК-Інвест» пабудуе тут 50000 квадратных метраў жылля.

З узвядзеннем новага жылля заўсёды паўстае праблема парковак. У будучым годзе нам паабяцалі пабудаваць першыя 10 паркінгаў на 99 машын кожны. Калі праект сябе апраўдае, то наступным крокам стане будаўніцтва яшчэ 44 такіх жа паркінгаў.

ПАМІЖ МІНУЛЫМ І БУДУЧЫМ

Што і казаць, бліскучай атрымалася экскурсія мэра па аб'ектах старога Брэсця. Наш гараданачальнік ведае на памяць усе даты, усіх гістарычных асоб даўніны. «Горад быў пабудаваны візантыйскімі майстрамі і па прыгажосці мала чым саступаў Кракаву і Празе таго часу, — гаварыў Аляксандр Сяргеевіч. — Менавіта Брэст першым з беларускіх гарадоў атрымаў Магдэбургскае права. Тут чаканілі грошы, збіралі падаткі, у нас была свая друкарня, свой Сейм. У Брэсце распрацавалі план ваеннай кампаніі 1410 года, вынікам якой з'явілася Грунвальдская бітва і перамога. У XIV—XVI стагоддзях Брэсце было найбуйнейшым горадам ВКЛ. Наш горад плаціў у казну княства болей, чым Коўна, Уладзіміра-Валынск, Мінск і Смаленск разам узятыя. Узносы Брэсця перавышалі ўзносы Кіева. Калі расійскім імператарам было прынята рашэнне аб пераносе горада, у Брэсці пачаліся масавыя хваляванні. Свядомыя гараджане патрабавалі сабраць чарцяжы і схемы пабудоў старога горада. І яны захаваліся. Таму старое Брэсце не страчана канчаткова, яно можа быць узноўлена», — падвёў рысу мэр пад гістарычным экскурсам.

Разам з узвядзеннем цярэспальскага моста плануецца прывесці ў парадак востраў Пагранічны — месца старога горада. Там запланавана ўзнавіць некалькі гістарычных комплексаў — манастыроў брыгітак, ён існаваў да 1946 года, бернардынцаў і бернардынак. У гэтых будынках могуць размясціцца Дом грамадзянскіх абрадаў, музей горада, кавярні, гасцініцы.

БЕТОНУ БОЛЬШ, А ЗЕЛЯНІНЫ...

Сапраўды, многія праекты і задумкі гарадской улады і архітэктараў падаліся вельмі прывабнымі. Ну як не парадавацца таму, што рачны порт будзе вынесены за рысу горада і прама па цэнтральных вуліцах перастануць дыміць шматтонныя грузавікі з пяском і шчэбнем?

Але і на прывабных эскізах, калі прыгледзецца, відаць як горад паступова і настойліва апранаецца ў бетон а трава і дрэвы знікаюць. Гарадскія ўлады патрацілі гады і нервы на пошук інвестараў для рэканструкцыі ачысных збудаванняў. Перабудова і паляпшэнне гарадскіх ачысных павінна прывесці да таго, што з вуліц знікне непрыемны пах, ад якога горад літаральна пакутуе апошнімі гадамі. Але гэты смурод, магчыма, не так адчуваўся б, каб у горадзе было больш зялёных астраўкоў. А іх усё менш. Вось і Дом друку нядаўна абгарадзілі па самы ганак жоўтым жалезным плотам. Некалі нядрэнны архітэктар намаляваў гэты дом у выглядзе раскрытай кнігі. Відаць, той самы праекціроўшчык прадугледзеў, што форму кнігі працягвае зялёны лужок з дрэвамі, які дастаяў да гэтага часу. Дрэў тут патрэбна яшчэ больш, бо ўлетку ў гэтым месцы на самым ажыўленым участку адной з цэнтральных трас вісіць сапраўдны смог. «Тут будзе ўзведзены будынак усіх падатковых інспекцый горада. Пытанне вырашана», — адказаў карэспандэнту «Звязды» мэр. І ўжо наступнае пытанне наконт адпаведнасці гэтай высознай каробкі архітэктуры вуліцы Малая, якую яна закране, задавацца не было каму.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Падрабязнасці

АБ СПРАВАХ «ЗВЫЧАЙНЫХ» І «ГУЧНЫХ»

ішла гаворка ў Гродне на семінары-нарадзе мясцовых выканаўчараспарадчых і праваахоўных органаў па выкананні закона Рэспублікі Беларусь «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў», а затым на прэс-канферэнцыі пракурора вобласці.

У чым недапрацоўваем у прафілактыцы правапарушэнняў? У прыватнасці, шмат дзе фармальна ставяцца да працаўладкавання людзей, якія вярнуліся з месцаў пазбаўлення волі. Сёлета з 1846 такіх грамадзян працаўладкавалі 1066, альбо 57,7 працэнта. Прычым у лік броні на такую катэгорыю — толькі 132 чалавекі, хоць было 679 вакансій. Слаба выкарыстоўваецца патэнцыл працоўных калектываў і грамадскіх фарміраванняў. Не ўбачыш канкрэтных вынікаў у дзейнасці большасці Саветаў грамадскіх пунктаў аховы парадку, створаных на базе органаў ЖКГ у райцэнтрах. Ды і шэраг добраахвотных дружын створаныя хіба што на паперы і рэальна не ўплываюць на стан правапарадку. Пры гэтым многія выканкамы не ў поўнай меры выкарыстоўваюць прадастаўленае заканадаўствам права заахвочвання людзей, якія ўдзельнічаюць у працы па прафілактыцы правапарушэнняў, а таксама абавязковага асабістага страхавання членаў добраахвотных дружын за кошт мясцовых бюджэтаў.

Гаворачы пра «гучныя» справы, **пракурор Гродзенскай вобласці Віктар МАРОЗАЎ** паведаміў журналістам, што былы начальнік управлення ўнутраных спраў аблвыканкама, генерал-маёр міліцыі Генадзь Хацько прызнае віну ў выкарыстанні службовых паўнамоцтваў пры будаўніцтве ўласнага дома. Улічваючы тое, што ён добраахвотна з'явіўся ў пракуратуру і гатовы кампенсаваць дзяржаве страты, якія (выкарыстанне тэхнікі, людзей) сёння ацэньваюцца прыкладна ў 30 мільёнаў рублёў, прынята рашэнне змяніць яму меру стрымання з арышту на падпіску аб нявыездзе. Пры гэтым па законе ў Г. Хацько ёсць права звярнуцца да Прэзідэнта Беларусі і пры ўмове кампенсацыі прычыненых стратаў і станоўчага рашэння кіраўніка дзяржавы не выключаны варыянт вызвалення ад крымінальнай адказнасці. Гэта прадугледжана артыкулам 88-прым Крымінальнага кодэкса Беларусі «Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў сувязі з добраахвотнай кампенсацыяй прычыненых стратаў (шкоды)». Такая практыка ўжо напрацаваная, і асабліва гэта датычыцца крымінальных спраў па ўхіленні ад выплаты падаткаў.

Што ж датычыцца далейшага лёсу былога намесніка начальніка УУС Гродзенскага аблвыканкама Сяргея Рудніка, то крымінальная справа ў дачыненні да яго цяпер знаходзіцца ў судзе. Ён, зазначыў пракурор вобласці, адказвае не толькі за тое, што дапамагаў Хацько будаваць дом, але і за ўласныя злоўжыванні з выкарыстаннем службовага становішча.

А вось крымінальная справа ў дачыненні да дырэктара Гродзенскага мясакамбіната Анатоля Грышука спыненая, паведаміў пракурор вобласці. Кіраўнік прадпрыемства падазраваўся, што быццам бы танна прадаў прыватнай структуры аб'ект, які належаў акцыянернаму таварыству. А таксама ў тым, што пост пазаведамаснай аховы, на думку следства, выконваў функцыі аховы адначасова і мясакамбіната, і прыватнай струкатуры. Аднак следчыя дзеянні і рэвізіі не далі доказнай базы, каб справу накіраваць у суд. Таму за два тыдні да заканчэння тэрміну расследавання пракурор вобласці папярэдзіў, што следства больш працягвацца не будзе і трэба прыняць працэсуальнае рашэнне. А паколькі яно органамі ўнутраных спраў затрымлівалася, то пракуратура, выкарыстоўваючы свае паўнамоцтвы, сама вынесла пастанову аб спыненні крымінальнай справы. Пры гэтым улічвалася меркаванне рэспубліканскіх органаў, якія ўдзельнічалі ў прававой ацэнцы продажу аб'екта, што продажная цана — гэта прэрагатыва акцыянернага таварыства, якім з'яўляецца Гродзенскі мясакамбінат. А каб ухіліць нейкую двухсэнсоўнасць наконт паста пазаведамаснай аховы, пракуратура прапанавала кіраўніцтву абласнога аб'яднання «Ахова» скарэктаваць яго дыслакацыю. І сёння ўжо нельга сказаць, што гэты пост ахоўвае і мясакамбінат, і прыватную структуру.

Віктар Марозаў таксама паведаміў, што крымінальная справа ў дачыненні да былога кіраўніка расійска-беларускага прыватнага прадпрыемства «Кансент» Андрэя Лушча ў снежні будзе накіраваная ў суд. Падчас расследавання было, у прыватнасці, даказана, што ён паклаў у кішэню, абманяві праз фірмы, якія фактычна не функцыянуюць, 45 мільёнаў рублёў. Гаспадарчы суд задаволіў іск пракурора вобласці аб ліквідацыі гэтага суб'екта гаспадарання ў сувязі з грубымі і неаднаразовымі парушэннямі заканадаўства Беларусі. І адразу ж пасля ўступлення гэтага рашэння ў законную сілу распачала працу ліквідацыйная камісія пад старшынствам дырэктара ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Гродзенскага аблвыканкама Валерыя Косарава. Яна павінна вырашыць пытанне пра ўступленне забудоўшчыкаў жылога комплексу «Ліра» па вуліцы Захарава і шматкватэрнага дома па вуліцы Парахавой у Гродне ў дагаворныя адносіны з новым падрадчыкам, якім, верагодна, стане прадпрыемства «Гроднажылбуд», і выпрацаваць варыянты вырашэння іншых праблем, звязаных з завяршэннем будаўніцтва жылых аб'ектаў. Пры гэтым, улічваючы форс-мажорныя абставіны, па хадайніцтве мясцовых уладаў банкі прыпынілі спагнанне пені з падманутых забудоўшчыкаў па разліках за ўзятыя крэдыты.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

У Магілёўскай вобласці памоляцца за ахвяр аўтамабільных аварый

21 лістапада будзе адзначацца Сусветны дзень памяці ахвяр дарожна-транспартных здарэнняў. Перад гэтым тыдзень памяці праходзіць у гарадах і сельскіх раёнах Беларусі.

Кожны супрацоўнік Магілёўскай ДАІ правядзе гутаркі пра бяспеку руху ў працоўных калектывах і школах. У цэрквах замоўленыя памінальныя службы памяці ахвяр аўтаздарэнняў і за здароўе ўсіх вадзіцеляў, пасажыраў і пешаходаў. У школах дзеці малююць паштоўкі і пішуць слёзныя сачыненні на адрас вадзіцеляў: у бліжэйшую суботу лепшыя паштоўкі атрымаюць з рук інспектараў ДАІ ўдзельнікі дарожнага руху.

— Мы таксама заклікаем вадзіцеляў ушанаваць памяць ахвяр аварый і ездзіць з уключаным бліжнім святлом фар увесь тыдзень, — сказала **начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды Магілёўскай ДАІ Віктарыя ЖЭЎНЕР**.

У Магілёўскай вобласці ад пачатку года адбылося 745 ДТЗ, у якіх 112 чалавек загінулі і 855 атрымалі траўмы. Аварый адбылося болей, чым летась, колькасць параненых таксама павялічылася, а вось колькасць загінулых скарацілася. Аднак у Магілёўскай ДАІ адзначаюць трывожную тэндэнцыю: сёлета ахвярамі здарэнняў на дарозе сталі 6 дзяцей, і толькі ў лістападзе — ужо двое. Апошні выпадак здарыўся 11 лістапада ў вёсцы Вяззе Асіповіцкага раёна, калі з-за няўважлівасці вадзіцеля загінула 3-гадовая дзяўчынка. Трагедыя яшчэ і ў тым, што вінаўнік аварыі — бацька ахвяры.

Ілона ІВАНОВА.

УСЕ СПОСАБЫ ДОБРЫЯ?

З дапамогай качаргі вучыў жыць 80-гадовы дзед свайго 30-гадовага ўнука ў вёсцы Новае Палессе Лельчыцкага раёна.

Для маладзейшага «вучоба» закончылася ранай галавы і бальнічным ложкам. А вось беспрацоўны жыхар Чырвонага Берага, што ў Жлобінскім раёне, знайшоў іншы спосаб для высвятлення ўзаемаадносін з сужыцелькай — ён пагражаў яе забіць, пры гэтым папярэдне абліў жанчыну... гарэлкай.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Погляд

МАРАТОРЫЙ НА «ВАЛЮТНЫЯ БАЯВЫЯ ДЗЕЯННІ»

ВЫНІКІ саміту «Вялікай дваццаткі» ў сталіцы Паўднёвай Карэі мы папрасілі пракаментаваць вядомага беларускага эканаміста і аналітыка, члена Грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Л.Ф. ЗАІКУ.

— «Вялікай дваццатцы» (G20) удалося прыпыніць спаўзанне самых развітых эканомік свету да развязвання «валютных баявых дзеянняў». Гэта, бадай, галоўны вынік сустрэчы кіраўнікоў дваццаці самых развітых краін планеты. Бо ў свеце рэальна ўзніклі абрысы новага фінансавага крызісу, да якога маглі прывесці, як гэта ні дзіўна, антыкрызісныя меры некаторых краін. У першую чаргу ЗША, якія вырашылі надрукаваць 600 мільярдаў долараў (адна з антыкрызісных мер Вашынгтона), і Кітая, які доўгі час штучна заніжае курс юаня. У гэтай сітуацыі сваю гульню вядзе і Еўрасаюз, якому вельмі нявыгаднае празмернае ўмацаванне курсу еўра. Безумоўна, у свеце ад сустрэчы лідараў «Вялікай дваццаткі» чакалі канкрэтных дзеянняў і мер па прадухіленні «валютных войнаў». І надзеі гэтыя часткова, на мой погляд, спраўдзіліся.

Упершыню саміт «Вялікай дваццаткі» не абмежаваўся падпісаннем традыцыйнай дэкларацыі, а прыняў план дзеянняў для кожнай з краін, у тым ліку і для ўсёй «Дваццаткі» ў цэлым. Упершыню членам G20 удалося дамовіцца аб агульных мерах па прадухіленні «валютных баявых дзеянняў». Звяртае на сабе ўвагу у першую чаргу рашэнне адмовіцца ад так званай канкурэнтнай дэвальвацыі валют. Гэта калі тая ці іншая дзяржава штучна паніжае курс уласнай валюты з мэтай атрымаць пэўныя канкурэнтныя выгоды на сусветных рынках. Таму саміт «Вялікай дваццаткі» вырашыў паступова набліжацца да такіх валютных курсаў, суадносіны якіх адпавядалі б рэаліям рынку, залежалі ад канкрэтнай сітуацыі з узроўнем экспарту-імпарту ў краіне. І такім чынам больш адэкватна адлюстроўвалі яе эканамічныя паказчыкі, папярэджвалі памкненні асобных краін да дэвальвацыі валют. Шкада, што на саміце не прагучала крытыка ў бок краін, якія грашылі эксперыментамі з валютай, з-за чаго ўзнікла рэальная пагроза «вайны» сусветных валют.

Сёння, на погляд многіх аналітыкаў, такая пагроза пасля саміту стала істотна ніжэй, ёсць час выправіць перакосы ў сусветным валютным рэгуляванні. Аптымізм усяляе і заява ў Сеуле прэзідэнта ЗША Барака Абамы, які паабяцаў праводзіць больш узважаную валютную палітыку. Паглядзім, як яно будзе выконвацца. Для нас галоўнае, каб курс долара — сусветнай рэзервовай валюты — штучна не паніжаўся. Бо гэта на самай справе з'яўляецца (і такога меркавання прытрымліваюцца многія вядомыя эканамісты Еўропы і Азіі) глабальным рабаваннем. Важна адзначыць, што і Кітай адобрыў усе выніковыя дакументы саміту і таксама паабяцаў больш стрымана весці сябе ў валютнай сферы. Такім чынам, можна супакоіць чытачоў «Звязды»: новы крызіс, да якога маглі прывесці антыкрызісныя меры некаторых краін, папярэджаны. І гэта, безумоўна, заслуга ўдзельнікаў саміту. Дарэчы, лідары «Дваццаткі» вырашылі ў наступны раз сустрэцца не праз паўгода, а праз год.

Дасягненнем саміту можна лічыць і яго рашэнне аб перараз меркаванні квот у МВФ на карысць тых краін, якія апошнім часам хутка развіваюцца і дасягнулі ўражальных вынікаў. Гэта рашэнне адлюстроўвае змены ў сусветнай эканоміцы. Бо не проста так развіты краіны вырашылі саступіць 6 працэнтаў сваіх квот Кітаю, Індыі і Бразіліі. Гэта прывядзе да павышэння ўдзельнай вагі іх галасоў, уплыву ў савеце кіраўнікоў МВФ. Яшчэ адно цікавае рашэнне «Дваццаткі» — прыняты сумесны план дзеянняў супраць карупцыі. Цяпер карупцыянеры з «бруднымі» мільёнамі ўжо не змогуць схавацца за мяжой ад закона сваёй краіны.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Аляксей ТАРБІН:

«СУМЫ КАНТРАКТАЎ ХАКЕІСТАЎ АДПАВЯДАЮЦЬ ВЫНІКАМ, І ГЭТА РАДУЕ»

Кіраўніцтва мінскага хакейнага «Дынама» расказала, за што штрафуюць гульцоў

ПАКУЛЬ у Кантынентальнай хакейнай лізе працягваецца 10-дзённы перапынак, у нашым «Дынама» не стамляюцца падводзіць вынікі выступлення клуба на стартавым адрэзку, які ўключаў 25 матчаў. І сапраўды, клубнаму кіраўніцтву ёсць чым ганарыцца: упершыню за тры сезоны ў КХЛ мінскае «Дынама» не праваліла пачатак сезона і мае пакуль выдатныя шанцы на плэй-оф. Акрамя таго, пакуль абышлося і без гучных трэнерскіх адставак — Марэк Сікора на сваім месцы, і ацэнку (у тым ліку і яго працы) даў в.а. генеральнага дырэктара клуба Аляксей Тарбін.

— Трэнерскі штаб дастойна робіць сваю працу. Усе нашы дамовы Марэк Сікора выконвае. А тое, што была ў «Дынама» серыя паражэнняў, то тут мы разумеем, што ў хакеі здараецца ўсякае. «Махаць шашкай» у той момант — нават думкі такой не было ў нас, — даў ацэнку Аляксей Тарбін.

Сталічнае «Дынама» — клуб, які напалову складаецца з легіянераў. Аляксей Тарбін расказаў, якія бытавыя пытанні прыходзіцца вырашаць, каб дагадзіць прыезджым хакеістам.

— Ёзэф Штумпэл прывёз у Мінск сваю сям'ю. У яго трое дзяцей. Усіх нам давялося ўладкоўваць у школу. Роберт Эш плануе прывезці сям'ю, бо, паводле яго асабістых назіранняў, у Мінску, у адрозненні ад Масквы і Піцера, на вуліцах шмат дзяцей. З сям'ёй тут плануе жыць і Петр Сікора. Мы задавальняем усе пажаданні хакеістаў, — расказаў в.а. генеральнага дырэктара.

Петр Сікора будзе адзіным новым легіянерам, як пацвердзіў Аляксей Тарбін:

— Мы хацелі б узмацніцца беларускімі гульцамі. Пакуль нікога з легіянераў набываць не збіраемся. Калі набываць, мы павінны падумаць, каго яны заменяць. Мы задаволеныя тым, што запрасілі Петра Сікору. Прызнаюся, спачатку, мы не былі ўпэўненыя ў яго выніковасці, былі сумненні наконт траўмы. Але Петр паабяцаў, што, калі абудзецца рэцыдыў траўмы, ён сам пакіне клуб. Яшчэ ён абяцаў шмат забіваць і зарабляць шматачкоў...

Раскрываць суму кантракта з чэшскім нападаючым кіраўніцтва «Дынама» не стала. У НХЛ, у «Мінесоце», дзе яшчэ летась выступаў Петр Сікора, яго зарплата складала 1,6 мільёна долараў. Але будзем мець рацыю, калі выкажам меркаванне, што «Дынама» наўрад ці прапанавала 33-гадоваму чэху столькі ж. Аляксей Тарбін адзначыў, што ніякіх прэтэнзій да легіянераў па неапрацаваны высокіх заробках у яго няма:

— Тыя, на каго мы разлічвалі і ў каго адпаведна большая сума кантракта, больш выкладваюцца і маюць лепшыя вынікі. Сумы кантрактаў адпавядаюць вынікам, і гэта радуе.

Дарэчы, балельшчыкі «Дынама» ўбачаць Петра Сікору ўжо ў бліжэйшых гульнях:

— У матчы з чалябінскім «Трактарам» хакеіст хутчэй за ўсё выйдзе на лёд. Марэк Сікора на трэніроўках ставіць яго ў звяно з Платам. І Плату, што цікава, гэта надае дадатковы імпульс і ўпэўненасць, — падзяліўся Аляксей Тарбін.

Кантракт з Петрам Сікорай разлічаны на 3 гады, але гэты тэрмін можа быць скарочаны. Яшчэ адзін вядомы хакеіст, які ў хуткім часе, магчыма, з'явіцца ў «Дынама», — беларус Міхаіл Стэфановіч, які зараз выступае за «Таронта».

— Мы дамовіліся з «Таронта» пра ўмовы. Яны даюць нам Міхаіла на правах арэнды. Але пакуль мы ўзялі паўзу. У два бліжэйшыя тыдні канчатковае рашэнне будзе прынята.

Як расказаў Аляксей Тарбін, гульцоў «Дынама» не толькі заахвочваюць фінансава. Хакеіст можа быць і пакараны.

— Штрафы — адзін са спосабаў дысцыплінарнага ўплыву. За неапраўданае выдаленне, напрыклад. Але калі ў наступнай гульні хакеіст выправіўся і каманда атрымала вынік, мы адмяняем штраф. І гэта дзейнічае! Гулец таксама можа быць пакараны за адмову ад медыцынскага агляду, за невыкананне патрабаванняў трэнера і яшчэ некаторыя парушэнні.

А вось за адмову салігорскага «Шахцёра» прымаць хакеістаў, якія «сасланыя» ў фарм-клуб, дамова з гэтым клубам была скасаваная.

Замест «Шахцёра» фармам стала мінскае «Юнацтва»:

— Канфлікту ў нас не было з «Шахцёрам». Была дамова, у адпаведнасці з якой мы маглі камандзіраваць гульца ў фарм-клуб. Але «Шахцёр» сказаў, што ім гэта нявыгадна і не патрэбна. Дамову скасавалі па абаюднай згодзе. Кантракты з Дзямковым і Развадоўскім скасаваныя па той прычыне, што яны гуляюць за «Шахцёр», прыносяць яму ачкі. А бюджэт мінскага «Дынама» разлічаны толькі на заработную плату гульцоў гэтай каманды. «Юнацтва» не супраць, каб мы да іх гульцоў адпраўлялі. Качаткова накіравалі, Окса будзе там гуляць. «Юнацтва» ідзе нам насустрач, яны далі нам на прагляд гульцоў — Шэлега, Бараўкова. Шэлега мы падпісалі, за Бараўковым пакуль назіраем, — расказаў Аляксей Тарбін.

Напрыканцы в.а генеральнага дырэктара падвёў вынік:

— Я задаволены, што ў камандзе нармальная атмасфера, што яна вытрымала ўдары, адным з якіх быў выезд у Бабруйск. Гульцы адэкватна аднесліся да няўдач. Прыемна, што павялічылася наведвальнасць на «Мінск-Арэне», туды сталі прыходзіць дзеці, жанчыны. Я задаволены, што на выездзе каманду суправаджае каля сотні балельшчыкаў. Прыемна, што ў камандзе прагрэсуюць беларускія хакеісты, а галоўны трэнер знаходзіць да іх падыход і верыць у іх.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

БУДУЕМ ДОМ: бераўліва і з розумам

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

...Мінскае ўнітарнае прадпрыемства «Ноатэхніка» прадстаўляе інавацыйную электронную тэхніку, распрацаваную каля дзесяці гадоў таму ў сценах кампаніі. Зрэшты, такой пакуль яна з'яўляецца хіба для нас, бо на Захадзе «разумны дом» — даўно не навіна. Напачатку сваю прадукцыю ўнітарнае прадпрыемства пастаўляла ў Расію, дзе найперш масквічы таксама «адчулі смак» да яе, як патлумачыла нам начальнік аддзела збыту Наталля СЦЕЛЬЧАНКА. Беларусы ж спярша праяўлялі пэўны недавер, аднак апошнім часам інтарэс абудзіўся і ў суайчыннікаў. Дык пра што ж гаворка?

Замяніўшы звычайны выключальнік на дыстанцыйны выключальнік-рэгулятар ад «Ноатэхнікі», вы зможаце ўключаць, выключаць і рэгуляваць яркасць асвятлення ў пакоях не толькі ўручную, але і дыстанцыйна з дапамогай пульта. Прычым падыдзе любы пульт — ад тэлевізара, музычнага цэнтра. Зручна, сучасна — чым не своеасаблівая «фішка» інтэр'ера? Убудаваны рэжым плаўнага ўключэння пазбаўляе вочы ад шкоднага ўздзеяння рэзкай успышкі святла, а таксама значна падаўжае тэрмін службы лямпачак. А, напрыклад, калі вы паедзеце некуды ў адпачынак, у спецыяльным рэжыме такі выключальнік-рэгулятар выпадковым чынам будзе уключаць і выключаць святло, імітуючы вашу прысутнасць у жыллі. Цана пытання? Каля 38 тысяч рублёў, што значна менш за імпартны аналаг.

Ці, скажам, вы часта пакідаеце святло ў калідоры, вітальні ці на лесвічнай пляцоўцы. Праблему можна вырашыць пра дапамозе таймера адключэння асвятлення. Яго можна запраграмаваць на аўтаматычнае адключэнне святла праз прамежак ад 30 секунд да 20 хвілін. Таймер для санвузла забяспечыць працу вентылятара на працягу пяці хвілін пасля вашага выхаду з прыбіральні ці ваннага пакоя.

...Пагадзіцеся, хто не чуў пра «блакітную мару» любой гаспадыні: пакуль ты на працы або едзеш дадому, нехта за цябе прыбірае жыллё? Або ты бавіш час з сямейнікамі ў выхадныя, а хтосьці ці яшчэ штосьці — завіхаецца па гаспадарцы... Дык вось, такое тэхнічнае «штосьці» з вясны гэтага года пачаў пастаўляць у нашу краіну генеральны дылер — сталічная будаўнічая кампанія «Інтэр'ербуд». Называецца яно — аўтаматычныя сістэмы ўборкі дома, або, калі папросту, робаты-пыласосы амерыканскай вытворчасці. Гэта — дыскі дыяметрам 33—37 сантыметраў, вышынёй 8-9 сантыметраў, вагой крыху больш за 3,5 кілаграма. Бываюць для сухой уборкі і для вільготнай. Тры гадзіны на зарадку акумулятара, і робат гатовы самастойна (па вашай праграме ён уключыцца, нават калі гаспадароў не будзе дома) прыбраць на адной зарадцы да 80 квадратных метраў плошчы.

— Адзін пакой плошчай у 20 «квадратаў» робат-пыласос прыбярэ за 40 хвілін, — зазначыла эканаміст па збыце прадпрыемства Вольга КЯЦКО.

— Дык я значна хутчэй і прапыласошу і памыю такі ж пакой...

— Але робат чысціць не толькі адкрытую прастору, але і «пралазіць» пад мэблю (напрыклад, канапу), вакол ножак, у кутах і ўздоўж сцен. Прычым ён не блытаецца ў правадах, можа пераадольваць, напрыклад, парогі вышынёй да трох сантыметраў, а пасля завяршэння працы сам вяртаецца на зарадную базу, — расказвае далей Вольга.

Ёсць толькі адна мадэль мыючага робата-пыласоса (адной запраўкі вады хапае прыкладна на 40 квадратных метраў, можна выкарыстоўваць звычайныя мыйныя сродкі), праўда, прызначаная выключна для ўборкі цвёрдай паверхні падлогі. Каштуе 590 еўра. Для сухой уборкі прапануецца некалькі мадэляў па цане ад 330 да 720 еўра. З дадатковых расходных матэрыялаў можа спатрэбіцца хіба толькі зменны фільтр. Вольга Кяцко сказала, што калі напачатку робаты-пыласосы ў суайчыннікаў выклікалі штосьці блізкае да здзіўлення і недаверу, дык апошнім часам іх набываюць прыкладна па паўсотні ў месяц.

Камінамі цяпер, напэўна, ужо нікога не здзівіш, як і навінкай іх не назавеш. Але яны па-ранейшаму карыстаюцца попытам.

— Таму што энергетыку натуральнага жывога полымя нічым іншым не заменіш, яна знаёмая чалавеку яшчэ са старажытнасці, — тлумачыць папулярнасць камінаў індывідуальны прадпрымальнік Сяргей ЖАРДЗЕЦКІ. — Камін — гэта ж не толькі і столькі цяпло.

Для дома дачнага тыпу ён раіць рабіць камін з топкай са шкляной дзверцай, бо яе ККД — 60 працэнтаў. У той час як, напрыклад, ККД ад адкрытай топкі з цэглы — толькі 20 працэнтаў. Суразмоўца працуе ў стылі кантры, хай-тэк, а таксама сюррэалізму. Шкада, што газетная плошча не дае магчымасці паказаць некаторыя ўзоры, якія нараджаюцца ў галовах заказчыкаў і потым увасабляюцца ў жыццё рукой майстра. Натуральна, такая праца — не паточная, патрабуе індывідуальнага падыходу. Ці дорага гэта каштуе? Верхняй планкі, вядома ж, не існуе. Але калі гаварыць пра самы просты камін з цэглы (з топкай шырынёй 50 сантыметраў і вышынёй 45 сантыметраў, з вывадам трубы), дык з улікам матэрыялаў і кошту працы такі камін будзе каштаваць ад 1,5 тысячы еўра.

...Украінскае прадпрыемства «Шклопрыбор» выпускае кантрольныя вымяральныя прыборы і бытавую прадукцыю — тэрмометры: аконныя, пакаёвыя, водныя, фасадныя. У выставах удзельнічае ў многіх краінах, у тым ліку і ў нас, больш за тое, мае тут беларускага партнёра. На сёлетні форум, як распавяла менеджар аддзела знешнеэканамічнай дзейнасці Наталля РАДЧАНКА з галаўнога прадпрыемства ў Кіеве, прывезлі некалькі навінак. У прыватнасці, гэта тэрмометры для басейна (з паплаўком і шнуром на два метры), а таксама пакаёвыя бытавыя тэрмометры, выкананыя на аснове з гіпсу. Серыя называецца «Знакі задыяка», і яе асабліваснасць з'яўляецца тое, што гэтыя сузор'і, дзякуючы дабаўленню фарбы, свецяцца ў цемры. Выглядае сапраўды вельмі прыгожа.

...На форуме прадстаўленыя праекты будаўніцтва дамоў і рэканструкцыі індывідуальных катэджаў, драўляныя дамы, вокны і дзверы, пакрыцці на падлогу, энергазберагальнае ацяпляльнае абсталяванне, катлы і радыятары, абсталяванне для ачысткі вады, прыборы ўліку газу, вады і цяпла, штучны і натуральны камень, каваныя вырабы, абсталяванне для лазняў, саўнаў, басейны і шмат яшчэ чаго іншага. Невыпадкова ж рэкламны слоган выставы — бераўліва і з розумам будуем дом — мы вынеслі ў загаловак. Каб эканоміць час, сродкі, а выбраць лепшае, сапраўднаму гаспадару лепш завітаць на будаўнічы форум.

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«Разумную» тэхніку для асвятлення паказвае Наталля СЦЕЛЬЧАНКА.

У руках Вольгі КЯЦКО мара гаспадыні: робат-пыласос.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

| Номер лота по порядку | Целевое назначение и месторасположение земельного участка | Начальная цена (руб.) | Размер задатка (руб.) | Расходы

НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ, НОВАЯ ТЭХНІКА І НОВЫЯ ЛЮДЗІ РОБЯЦЬ ЦУДЫ

На апошніх гектарах камбайн працаваў у вячэрні час.

Прадстаўляем суразмоўцаў



Андрэй Аляксандравіч КУНЦЭВІЧ застаў былую веліч і былую славу сваёй «малой радзімы» — вёскі Казловічы, цэнтра знакамітага калгаса імя Кірава, якім кіраваў Герой Сацыялістычнай працы Сяргей Лявончанка. Відаць, пад уплывам традыцый перадавога калгаса складваліся яго характар, адносіны да працы і зямлі-маці. Закончыў БІМСГ (цяпер БАТУ), адслужыў у арміі. Працоўная біяграфія пачынаецца ў роднай гаспадарцы, на пасадах інжынера і галоўнага інжынера, затым — намесніка старшыні. Выпускаўся старшынёй суседняй гаспадаркі — калгаса імя Тэльмана. З 2003 года — галоўны інжынер СУП «Аграсэрвіс — ССК», з 2005 — дырэктар.

Андрэй Аляксандравіч — старшыня раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Выбраны дэлегатам Усебеларускага сходу.

Аляксандр Аляксандравіч ГАПАНОВІЧ таксама мясцовы. Яго родны саўгас «Танежыцы» быў адной з тых гаспадарак, якія ў савецкія часы займаліся вырошчваннем насення цукровых буракоў. Што ўжо само па сабе гарантавала рабочым саўгаса і членам іх сем'яў цяжкую ручную працу на палетках з раннія вясны да позняй восені. Аляксандр Аляксандравіч успамінае тыя часы не вельмі добрым словам. Але так ці інакш, гэта яны фарміравалі яго як прафесіянала. Стаў ён выпускніком Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі як прафесіянала таксама ішло ў рэдкай гаспадарцы, дзе ён паспытаў хлеб экзаменатара, агранома і галоўнага агранома. Адзін час выконваў абавязкі кіраўніка саўгаса. З 2004 года ў «Аграсэрвісе».

А.К. Калі гаварыць пра ўсю разнастаіласць работ, якія выконваюць, то не будзем забываць таксама, што мы з'яўляемся і выпрабавальным палігонам для Слуцкага цукрова-рафінадкарнага камбіната, бо кожны год засяваем доследныя дзялянкі новымі сартамі насення альбо насенняводныя падрыхтаванымі на новых тэхналогіях, таіх як «Тры Д плюс». І вырошчваем на гэтых доследных дзялянках прадукцыю па ўдасканаленых тэхналогіях, выпрабоўваем новыя сродкі і розныя сістэмы абароны раслін ад хвароб і пустазелля. А таксама новыя ўгнаенні. Альбо падбіраем іншыя дозы тых сродкаў абароны і ўгнаенняў, якія ўжо шырока вядомы, і уся справа ў нейкім наватарскім падыходзе — з улікам асаблівасцяў года ці іншых знешніх фактараў. Нарыхтавалі, мы спрабавалі працаваць з розным ўгнаеннем розных вытворцаў, у тым ліку расійскіх. У апошні час перавагу аддаём прадукцыі Гомельскага хімзавода, яна здольная забяспечыць значную прыбаўку ўраджайнасці — да чатырох тон на гектары.

А.Г. Чаму ўсе навейшыя тэхналогіі, якія з'яўляюцца ў раслінаводстве, апрабоўваюцца на ўдасканаленых тэхналогіях, выпрабоўваем новыя сродкі і розныя сістэмы абароны раслін ад хвароб і пустазелля. А таксама новыя ўгнаенні. Альбо падбіраем іншыя дозы тых сродкаў абароны і ўгнаенняў, якія ўжо шырока вядомы, і уся справа ў нейкім наватарскім падыходзе — з улікам асаблівасцяў года ці іншых знешніх фактараў. Нарыхтавалі, мы спрабавалі працаваць з розным ўгнаеннем розных вытворцаў, у тым ліку расійскіх. А таксама новыя ўгнаенні. Альбо падбіраем іншыя дозы тых сродкаў абароны і ўгнаенняў, якія ўжо шырока вядомы, і уся справа ў нейкім наватарскім падыходзе — з улікам асаблівасцяў года ці іншых знешніх фактараў. Нарыхтавалі, мы спрабавалі працаваць з розным ўгнаеннем розных вытворцаў, у тым ліку расійскіх. У апошні час перавагу аддаём прадукцыі Гомельскага хімзавода, яна здольная забяспечыць значную прыбаўку ўраджайнасці — да чатырох тон на гектары.

Акрамя таго, аказваюцца паслугі па вырошчванні і ўборцы «салодкага карэння» пастаўшчыкам у васьмі раёнах — чатырох у Мінскай вобласці (Слуцкі, Салігорскі, Капыльскі і Клецкі) і чатырох ў Магілёўскай (Асіповіцкі, Глускі, Кіраўскі і Бабруйскі). Прычым у Асіповіцкім і Глускім раёнах слуцкі ўбіраюць цукровыя буракі фактычна на ўсёй тэрыторыі вырошчвання.

Што датычыць аб'ёмаў работ, то прадпрыемства збірала сёлета насенне камбайнамі і 0442 гектары. Сярэдняя нарадплоўка на камбайн атрымалася 1740 гектараў, максімальная — 2000 га (у большасці СВК, за выключэннем такіх перадавых, як «Сноў», якія ў асноўным складае 300—400 га.) Можна параўноўваць.

Інакш кажучы, адно СУП убрала 10 працэнтаў плошчаў, занятых пад цукровыя буракі ў Беларусі, 31 працэнт — у Мінскай вобласці і 40 працэнтаў у сыравінай зоне Слуцкага цукрова-рафінаднага камбіната.

І ніяга адна «фірменная» паслуга — кваліфікаванае, «нетраўматычнае» пагрузка ўраджаю з дапамогай спецыяльных высокаэфектыўных пагрузчыкаў «Кляйне», якія ў рабоце ёсць толькі ў «Аграсэрвісе». Гэтыя машыны дапамагаюць выконваць важную і даволі значную па аб'ёмах сельскагаспадарчую работу хутка, з найменшымі стратамі і з мінімумам ручной працы. Занятыя яны ўвесь светлавы дзень, і кожны ў стане адгрузіць ад паўтары да дзвюх тысяч тон ачышчаных ад зямлі буракоў. Пагрузчык абсталяваны трыма камерамі відэанагляду, кав кантралюйць, як працуюць трыццаць з лішнім прымачоў і мешч раскідзень за Бартыі. Пад самы пагрузчыкам камеры кантралююць работу транспарцёраў. Механізатар аддоўжа працэс пагрузкі не толькі візуальна, але і з дапамогай манітора.

Далей пра паслугі: сёлета ў сваіх чатырох раёнах Міншчыны работнікі «Аграсэрвіса» апрацавалі каля 50 тысяч гектараў сродкамі абароны раслін — такую плошчу здольны ахапіць толькі высокапрадукцыйныя, спецыяльна для гэтага прызначаныя апырскавалкі. Няма наведвацца на кожные поле на 4-5 разоў за перыяд вегетацыі раслін.

Прадпрыемства дапамагае гаспадаркам і на сяўбе цукровых буракоў, а з этага года і на ўзворванні палёў, бо набыло трактар «Дэон Дзір». Узарала недзе паўтары тысячы гектараў. Каб пералік паслуг быў поўным, скажам, што ў міжсезонне новыя МАЗы «Аграсэрвіса» працавалі на грузаперавозках.

А працуе ў калектыве 68 чалавек, з іх 14 спецыялістаў. Астатнія — прадстаўнікі рабочых прафесій.

Як бачым, параўнальна малады калектыў пакуль значнай аб'ёмы работ, працуе напружана і высокаэфектыўна. Пра гэта — дырэктар калектыўнага таварыства Андрэй Аляксандравіч КУНЦЭВІЧАМ і намеснікам дырэктара Аляксандрам ГАПАНОВІЧАМ.

Пра тое, як адно сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства выкапала 10 працэнтаў цукровых буракоў у краіне

Не бярэмся сцвярджаць, што больш такога ўнікальнага калектыву ў краіне няма, — бо дакладна не ведаем. Ведаем, што некалі яны стваліся амаль пры ўсіх цукровых заводах Беларусі. Магчыма, недзе і захаваліся. Адно можам сказаць абсалютна дакладна, што сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства (СУП) «Аграсэрвіс — ССК» пры Слуцкім цукрова-рафінадным камбінаце працуе надзвычай эфектыўна, на ўзроўні самых перадавых айчынных гаспадарак.

Стваранае яно было ў 2002 годзе як механізаваны атрад, каб забяспечыць Слуцкаму цукрова-рафінадному камбінату гарантаваны запас сыравіны для перапрацоўкі, бо аб'ёмы яе нарыхтоўкі не задавальнялі на той час самага буйнога вытворцу цукру ў краіне. Паступова гэтае вытворчае падраздзяленне перарасло ў сцісльая жыццявы механізаваны атрад, бо большы складанымі сталіваліся задачы (у прыватнасці, узраставі аб'ёмы работ), пад іх нарошчваўся кадравы і тэхнічны патэнцыял. Закупляліі новыя буракаўборачныя камбайны і іншыя прадугледжаныя тэхналогіяй механізмы, і сёння тут маюць каля 130 адзінак сельскагаспадарчай тэхнікі — сучаснай, перадавой, высокапрадукцыйнай. У тым ліку адразу шэсць нямецкіх буракаўборачных камбайнаў «Холмер», чатыры спецыяльныя пагрузчыкі «Кляйне», 13 прычэпных апырскавальнікаў фірмы «КАЛ», магутныя трактары, пагузі і ўсё іншае, што неабходна. Летась купілі два МАЗы з прычэпамі грузапамышляюо па 36 тон кожны, каб вывозіць уласныя буракі.

Дарэчы, тэхніка тут абнаўляецца пастаянна, за два апошнія гады купілі тры новыя «Холмеры», а таксама магутны трактар «Джон Дзір» з плугам. Ужо ў тым годзе ўзялі беларускі трактар МТЗ-3022 з плугам, самаходны французскі апырскавальнік, дыскатар айчыннай вытворчасці. Іншаму кажы чаго, штогод набываюць нешта надзвычай карыснае, патрэбнае, дзякуючы чаму можна пашырыць пералік паслуг.

Самы чае больш падрабязна спыніцца на відах работ, якія выконваюцца. Па-першае, «Аграсэрвіс» сам займаецца вырошчваннем цукровых буракоў, яго палеткі размешчаныя на арандаваных землях у Слуцкім і Капыльскім раёнах. Летась у СУП было 1122 гектары сваіх палёў, і сярэдняя ўраджайнасць на іх склала 504 цэнтнеры з гектара. Сёлета ўласныя плошчы павялічылісся — да 1256 гектараў. Праўда, э-за таго, што год быў неспрыяльны па кліматычных умовах, а далікатны прадукт вельмі рэагуе на надвор'е, ўраджайнасць чакаецца крыху меншая. Надалей стаіць задача так адпрацаваць тэхналогіі, каб звесці такую залежнасць да мінімуму.

На наступны год выраашана павялічыць уласныя плошчы фактычна ўдвая — да 2030 гектараў. Такім чынам, СУП «Аграсэрвіс — ССК» выходзіць на самыя высокія ў краіне паказчыкі па плошчы вырошчвання цукровых буракоў сярод спецыялізаваных гаспадарак.

Акрамя таго, аказваюцца паслугі па вырошчванні і ўборцы «салодкага карэння» пастаўшчыкам у васьмі раёнах — чатырох у Мінскай вобласці (Слуцкі, Салігорскі, Капыльскі і Клецкі) і чатырох ў Магілёўскай (Асіповіцкі, Глускі, Кіраўскі і Бабруйскі). Прычым у Асіповіцкім і Глускім раёнах слуцкі ўбіраюць цукровыя буракі фактычна на ўсёй тэрыторыі вырошчвання.

Што датычыць аб'ёмаў работ, то прадпрыемства збірала сёлета насіпо камбайнамі і 0442 гектары. Сярэдняя нарадплоўка на камбайн атрымалася 1740 гектараў, максімальная — 2000 га (у большасці СВК, за выключэннем такіх перадавых, як «Сноў», якія ў асноўным складае 300—400 га.) Можна параўноўваць.

Інакш кажучы, адно СУП убрала 10 працэнтаў плошчаў, занятых пад цукровыя буракі ў Беларусі, 31 працэнт — у Мінскай вобласці і 40 працэнтаў у сыравінай зоне Слуцкага цукрова-рафінаднага камбіната.

Объекты расположены по адресу: Минская обл., Дзержинский район, около дер. Логовище на земельном участке площадью 8,5975 га. Срок аренды земельного участка – 99 лет. **Условия использования земельного участка:** Победителю аукциона разрешено в установленном порядке изменение назначения недвижимого имущества и использование земельного участка для размещения объектов производственного назначения.

Условие аукциона по продаже недвижимого имущества: приобретение покупателем движимого имущества: стадион (трибуны), спортивный городок, спаренный лабиринт, стеллажи, пожарную сигнализацию, скамьи клуба, скамьи летней эстрады, демонтаж которого невозможен без нанесения ущерба государственному имуществу. Покупатель обязан перечислить цену реализации движимого имущества в сумме **11 081 200 белорусских рублей** на расчетный счет производственного республиканского унитарного предприятия «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 3012008660018, в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код банка 153001357, УНП 101099370.

Начальная цена предмета аукциона:	**479 072 183** белорусских рубля (в т.ч. объекты: 449 493 344, право заключения договора аренды земельного участка: 29 578 839).
Размер задатка:	**12 000 000** белорусских рублей.

Продавец: Департамент финансов и тыла Министерства внутренних дел Республики Беларусь (г. Минск, ул. Короля, 71,73 тел. 2185198, 2187321). **Арендодатель земельного участка:** Дзержинский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Дзержинск, пл. Дзержинского, 1).

Задаток для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 16 декабря 2010 года включительно**. **Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **16 декабря 2010 г. до 16:00.**

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» за 13 ноября 2009 г. № 215, 5 октября 2010 г. № 194

Дата и время проведения повторного аукциона:	**20 декабря 2010 г. в 12.00** *Начальная цена продажи объектов понижена на 50 %*

Капитальное строение (инв. № 610/С-96) и право заключения договора аренды земельного участка. Одноэтажное административное здание общ. пл. 480,2 кв.м, 1935 г/п (кап.ремонт 1962, 1991), стены бревенчатые, облицованы кирпичом, перегородки дощатые, перекрытие чердачное деревянное. Составные части и принадлежности: подвал со сходом в подвал, 2 холодные пристройки, крыльца. Объект расположен по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Минская, 21, на земельном участке площадью 0,1616 га. Срок аренды земельного участка 10 лет. Имеются ограничения в использовании земельного участка в связи с расположением объекта в водоохранной зоне р. Березина.

Начальная цена предмета аукциона:	**63 377 023** белорусских рубля (в т.ч. объект: 34 432 593, право заключения договора аренды земельного участка: 28 944 430).
Размер задатка:	**6 000 000** белорусских рублей.

Продавец: Государственное производственно-торговое объединение «Белхудожпромыслы» (г. Минск, ул. Захарова, 36, (017) 2948088). **Арендодатель земельного участка:** Борисовский районный исполнительный комитет (Минская область, г. Борисов, ул. Чапаева, 6).

Задаток для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 16 декабря 2010 года включительно**. **Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами – **16 декабря 2010 г. до 16.00.**

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» за 30 октября 2009 г. № 206.

Расчетный счет для внесения задатка для участия в аукционе: **№ 3642900000841** в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе (без НДС).

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 310, 312.**

Фотографии продаваемых объектов, а также информация о предмете аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома**: www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество» в разделах «Власть», «Управления и комитеты облисполкома».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукционы проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Фонд «Минскоблгосимущество» вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала проведения аукциона.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол о результатах аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным районным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка победителю аукциона (претенденту на покупку) внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (в случае предоставления рассрочки ее внесения соответствующими исполнительными комитетами – часть платы), возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, и расходы, связанные с формированием земельного участка, изменением и прекращением существования земельных участков в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельных участков; после совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, заключить в установленном порядке с Продавцом имущества договор купли-продажи недвижимого имущества, а с Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка; после заключения с райисполкомом договора аренды земельного участка в 2-месячный срок со дня даты принятия решения о передаче победителю земельного участка осуществить государственную регистрацию права на земельный участок; в случае изменения назначения недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение местного районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в сроки, установленные решениями местных районных исполнительных комитетов, и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактны тэлефон: 292-44-12.

e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

Добрынскага **Анатоля Уладзіміравіча з вёскі Шарэйкі** Калінкавіцкага раёна віншуем з 60-годдзем. Здароўя, шчасця, выдатнага настрою, доўгіх гадоў жыцця.

Родныя.

Дзве даты

17 лістапада

Сёння — **Міжнародны дзень студэнтаў.** Установлены ў 1946 годзе на Сусветным кангрэсе студэнтаў у Празе ў памяць чэшскіх студэнтаў-патрыётаў, расстраляных нямецкімі акупантамі 17 лістапада 1939 года.

1574 год — у Вільні пачала дзейнічаць друкарня Мамонічаў. У друкарні, заснаванай П. Мсціслаўцам на сродкі магілёўскіх купцоў Мамонічаў, выдадзена больш за 80 кніг, з іх каля 50-ці — на старабеларускай мове. Былі аддрукаваны, у прыватнасці, «Часовник», «Евангелле напростольнае», «Псалтыр». Была адзінай беларускай друкарняй, якая выпускала зборнікі заканадаўчых актаў, выданні прававога характару, у тым ліку «Трыбунал абывацелям Вялікага княства Літоўскага», «Статут Вялікага княства Літоўскага», канстытуцыі «вальных» соймӑў, шэраг палемічных твораў у абарону ўніі, напісаных І. Пацеем. Кнігі вызначаліся высокім паліграфічным і мастацка-арнаментальным афармленнем. Тут упершыню скарыстаны выбраленыя Грынем Іванавічам курсіўныя шрыфты, якія аднаўляюць графіку канцылярскага пісьма.

1923 год — у Савецкім Саюзе створана служба ўчастковых міліцыянераў.

Цытата дня:

«Калі ў цябе не застаецца выбару — станавіся адважным».

Яўрэйская прымаўка.

ДЗВЕРЫ

Дзверы — месца ўваходу і выхаду, тая частка хаты, якая сімвалізавала мяжу паміж жылой прасторай і падворкам. Яны сталі амбівалентным сімвалам: з аднаго боку, забяспечвалі «ахову», «абарону», з другога боку — давалі магчымасць апынуцца ў прасторы хаты. Адчыненыя дзверы забяспечвалі сувязь са знешнім светам, зачыненыя — ахоўвалі хату ад знешняга ўмяшальніцтва.

● У культуры ўсходніх славян у паўсядзённым жыцці правільным, ці нармальным, становішчам лічыліся зачыненыя дзверы. Адчыненымі яны маглі быць толькі ў тым выпадку, калі ў хаце адбываліся неардынарныя падзеі: смерць ці роды. І ў тым, і ў другім выпадку неабходна было «выпусціць» душу чалавека (таго, хто паміраў, або таго, хто павінен быў нарадзіцца).

● У час пахавання дзверы трымалі адчыненымі да таго часу, пакуль з хаты не вынесуць труну з нябожчыкам. Пасля гэтага дзверы зачынялі, а часам і замыкалі, каб душа памерлага не магла вярнуцца назад.

● Існавала строгае правіла: тыя, хто прыйшоў развітацца з памерлым, павінны выйсці з хаты праз тыя дзверы, праз якія і ўваходзілі.

● У народнай культуры дзверы часта былі супрацьпастаўленыя вокнам: «задушных» нябожчыкаў (самазабойц, тапельцаў і г.д.) выносілі з хаты не праз дзверы, а праз вокны.

● Дзверы, якія знаходзіліся ў непасрэднай блізкасці ад парога хаты, успрынялі на сябе яго семантыку — семантыку зоны смерці. Таму, каб абараніць дзіця ў той сям'і, дзе не гадаваліся дзеці, у дзень хрышчэння яго таксама не выносілі праз дзверы, а перадавалі праз акно на рукі хросным бацькам.

● Па правілах народнай культуры, у паўсядзённым жыцці смецце ў хаце неабходна было месці ад дальняй сцяны да дзвярэй, г.зн. са «сваёй» прасторы ў чужую. У адваротным выпадку лічылася, што дачка не выйдзе замуж. І толькі ў час пахавання парушалася гэта традыцыя: смецце мялі ад дзвярэй да цэнтра хаты.

● Асаблівая ўвага надавалася дзвярам у час вяселля. Нявесце не дазвалялася зачыняць дзверы бацькоўскай хаты, калі ў сям'і былі яшчэ незамужнія сёстры і нежанатыя браты. Інакш яны ніколі не створаць сваю ўласную сям'ю і назаўсёды застануцца ў бацькоўскай хаце.

● Свякроўка, калі маладыя ўваходзілі ў хату, зачыняла дзверы спінай, тым самым быццам бы зачыняла нявестку ў сваёй хаце назаўсёды.

● Дзверы выступалі і ахоўным сімвалам хаты, і ўсіх тых, хто за імі жыве. На дзвярах малявалі ці выпальвалі крыжы на Хрышчэнне, на Вялікдзень, у дзверы ўтыкалі рэчы-абярэгі (іголку, нож, відэлец і г.д.), над імі замацоўвалі падкову, упрыгожвалі траецкімі і купальскімі травамі, вянкамі.

● Прыкмячалі, калі на Тарасія Бяссоннага (10 сакавіка) дзверы сарвуцца з петляў, чакай бяды ў хаце. Таму ў гэты дзень дзверы абавязкова аглядалі, пры неабходнасці правілі, мазалі петлі.

● Пасля святаў, у выпадку эпідэміі, а таксама ў пэўныя дні года, неабходна было абпырскаць дзверы святой вадой, каб «змыць» чараўніцтва і ўсе беды. Часам гэты абрад выконвалі знахаркі: яны дадавалі ў хрышчэнскую ваду чацвярговую соль, попел з сямі пячэй і мылі верхнюю балку дзвярэй. Лічылася, што ў такім выпадку дом будзе захаваны на цэлы год.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗАО «РРБ-Банк» сообщает, что 15 ноября 2010 г. Правлением ЗАО «РРБ-Банк» (Протокол № 71 от 15.11.2010 г.) утверждены изменения № 3 в Правила организации обслуживания счетов клиентов Банка -- юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, которые вступают в силу через пять банковских дней с момента публикации.

УНП 100361187

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.41	16.08	8.27
Віцебск —	7.36	15.52	8.16
Магілёў —	7.31	16.58	8.27
Гомель —	7.21	16.01	8.40
Гродна —	7.55	16.24	8.29
Брэст —	7.49	16.31	8.42

Месяц

Першая квадра 13 лістапада. Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Арсенія.*

К. *Альжбеты, Валеры, Саламеі, Валерыя, Здзіслава, Рыгора.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

Усміхнемся!

Прыходзіць мужык дадому і бачыць: яго жонка расхаджвае паўголая па кватэры.

— Фіма! І што ты робіш? Хіба ж у цябе няма сукенак? — адчыняе шафу. — Паглядзі: вось белая, вось сіняя, чырвоная, добры вечар, зялёная...

☺

Папярэджанне ў лазернай лабараторыі: «Ўцалелым вокам у лазер не заглядваць!»

☺

Папялушка:

— Туфлік мне падышоў, калі вяселле?

Прынц:

— Гэта быў паўфінал. Цяпер будзем мераць бюстгальтар №5.

РУП «Витебский институт недвижимости и оценки»

- **оценка имущества (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, вред от залития, пожара и др.)**
- **организация и проведение аукционов**

Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества, обращенного в доход государства у РПУП «Витебский меховой комбинат»

Лот № 1: капитальное строение (инв. № 200/С-51471) деревообрабатывающий цех, площ. 652 кв.м по адресу: Витебск, ул. 2-я Прибережная, 1, начальная цена продажи 177 023 000 руб., сумма задатка 17 702 300 руб.

Лот № 2: капитальное строение (инв. № 200/С-64851) здание «Павильон Смоленск», площ. 70,1 кв.м по адресу: Витебск, ул. 2-я Прибережная, 1, начальная цена продажи 21 036 000 руб., сумма задатка 2 103 600 руб.

Аукцион состоится **13 декабря 2010 года в 12.00** по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по 10.12.2010 (включительно) по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация 13.12.2010 с 11.30 до 12.00 по месту проведения аукциона. Официальное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.07.2010 года № 146. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www.Ocenka.by.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8(0212) 435 435; 8(029) 591 00 02

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

28.12.2010 в 11.00 в здании Гродненского районного исполнительного комитета (г. Гродно, ул. Горького, 51) состоится аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков

Номер лота	Кадастровый номер и адрес земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Срок аренды	Начальная цена предмета аукциона, руб.	Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, руб.*	Примечание
1	2	3	4	5	6	7	8
1	422084012601000160 Республика Беларусь, Гродненская обл., Гродненский район, Квасовский с/с, аг. Свислочь, ул. Молодёжная, У-326	0,0070	Для строительства торгового павильона по продаже продуктов питания	50	65 254	2 500 000	
2	422084506803000008 Республика Беларусь, Гродненская область, Гродненский район, Коптёвский сельсовет, д. Коробчицы, У-60	0,1532	Для размещения объектов розничной торговли	50	1 466 091	2 500 000	Возмещение потерь сельскохозяйственного производства 4 472 500 руб.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) со дня опубликования настоящего извещения и до 17.00 22.12.2010 г. представляет в комиссию по организации и проведению аукциона на право заключения договора аренды земельных участков по адресу: г. Гродно, ул. Горького, 51, кабинет 20, документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в аренду по результатам аукциона;

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет Финансового отдела Гродненского районного исполнительного комитета филиал № 426 ОАО «АСБ Беларусбанк» код банка 199 № 3602514000062, УНН 500027345, назначение платежа 04002;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

представитель или уполномоченное должностное лицо юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представитель или уполномоченное должностное лицо иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представитель иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанный в извещении срок соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в настоящем извещении.

Осмотр земельных участков осуществляется претендентами на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное время в течение установленного срока приема заявлений.

Контактные телефоны: 75 70 59, 73 01 09.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Шаг аукциона – 10 % от предыдущей цены, называемой аукционистом.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия исполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка вносит плату за предмет аукциона, расчетный счет Финансового отдела Гродненского районного исполнительного комитета филиал № 426 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 199, расчетный счет 3602514000062, УНН 500027345, назначение платежа 04002; а также возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения – на расчетный счет Финансового отдела Гродненского районного исполнительного комитета филиал № 426 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 199,

САЛІГОРСКАМУ ХЛЕБАЗАВОДУ — 50

На канвееры печкі гарачая духмяная прадукцыя. Тут працуе пекар Марына МІХНАВЕЦ.

З салігорскімі хлебапёкамі «Звязда» сябруе даўно. Здавалася, толькі ўчора мы віншавалі прадпрыемства з яго 45-годдзем, але час непрыкметна праляцеў, і сёння завод — напярэдадні свайго чарговага юбілею. Звяздоўцы зноў завіталі да імянінніка, каб пацікавіцца — што змянілася з моманту нашага апошняга візіту, чаго дасягнула прадпрыемства за бягучую пяцігодку.

На Салігорскім хлебазаводзе можна заказаць тарты на любы густ. У іх вырабе ўдзельнічаюць кандытары Зоя КРЭЙЗА, Тамара БАЛЬШУНОВА, Людміла КАВАЛЕНЯ, Ксенія ЧАРАТУН. Салодкі стол упрыгожыць таксама па-мастацку зробленая карамель.

УПОР — НА ЯКАСЦЬ

— Нашаму заводу — 50. За плячыма — паўстагоддзя гісторыі, — распачаў гутарку **дырэктар Салігорскага хлебазавода Васіль Паўлавіч ПЕНЯЗЬ.** — За 50 гадоў свайго існавання прадпрыемства выпусціла каля 520 тысяч тон хлеба і хлебабулачных вырабаў, звыш 6 тысяч тон — кандытарскіх. Завод пастаянна разнастаіць свой асартымент, радуе спажыўцоў цікавымі і смачнымі навінкамі. Варта ўзгадаць наш хлеб «Марачанскі» (у гонар мясцовай ракі Морач), выраблены па ўласнай арыгінальнай рэцэптуры да юбілею роднага горада. Духмяны падарунак па сваіх смакавых якасцях не саступае лепшым сталічным гатункам і ў сваім рэгіёне трывала замацаваў свае пазіцыі.

Мы з'яўляемся філіялам РУП «Барысаўхлебпрам», куды апроч нас яшчэ ўваходзяць Маладзечанскі, Нясвіжскі, Жодзінскі і Вілейскі хлебазаводы. Без падтрымкі аб'яднання мы не змаглі б дасягнуць сённяшніх выдатных вынікаў. Хлебапячэнне — гэта такая галіна, дзе пастаянна трэба вучыцца, перайманаць перадавы вопыт і ўкараняць яго на сваім прадпрыемстве. Мы працуем не ў ізаляцыі, а ў цесным узаемадзеянні з нашымі калегамі, як у межах вобласці, так і краіны ў цэлым. Сустракаемся на саветах дырэктараў, ездзім адзін да аднаго вучыцца. Усе беларускія хлебапёкі трымаюцца разам і сумесна вырашаюць агульныя пытанні нашай галіны.

...Усё, што робіцца на заводзе, робіцца людзьмі, калектывам, падкрэсліў Васіль Паўлавіч. Без калектыву не было работніку неабходна было кожны батон уручную надрэзаць, «перасадзіць» у печ. А цяпер усё гэта робіць аўтаматыка. Чалавек толькі кантралюе работу лініі.

— За апошнія 5 гадоў у нас была праведзена маштабная мадэрнізацыя, — расказаў **галоўны інжынер завода Валерый Якаўлевіч КАЗЛОЎ,** які працуе на прадпрыемстве з 2002 года, — але работа значна ўскладнялася з-за абмежаванасці ў плошчы. У нас нестае вытворчых памяшканняў. Завод размешчаны ў цэнтры горада — нам проста няма куды пашырацца.

У 2006 годзе мы правялі тэхнічнае пераабсталяванне лініі па вытворчасці фармавых хлябоў, замянілі цестамес на чэшскі, устанавілі новыя вытворчыя сіласы, дазатары мукі і вадкіх кампанентаў. У 2007 годзе на лініі па вытворчасці подавых хлябоў памянялі цестамясільнае абсталяванне і вытворчыя сіласы.

У 2008 годзе мы зрабілі поўнае пераўзбраенне лініі па вытворчасці булачных вырабаў, устанавілі новую чэшскую печ, набылі пончыкавы апарат і аўтаматычную хлебарэзку. У 2009 годзе мы памянялі печ па вытворчасці подавых хлябоў.

Увогуле, у Беларусі абсталяванне для хлебапякарнай прамысловасці не вырабляецца, таму ў нас усё абсталяванне імпартнае — расійскае, італьянскае, чэшскае — у залежнасці ад таго, якое найбольш падыходзіць і можа быць устаноўлена на нашых абмежаваных плошчах.

У 2008 годзе на тэхнічнае пераабсталяванне мы затралілі 622 мільёны сваіх інвестыцый. У 2009 — 390 мільёнаў, а за 10 месяцаў бягучага года — 1,2 мільярда рублёў. Сёлета мы сканцэнтравалі ўвагу на тэхнічным пераабсталяванні кандытарскага ўчастка. На яго быў затрачаны амаль 1 мільярд рублёў. Там мы ўстанавілі новую ратацыйную газавую і новую электрычную печкі для выпякання кандытарскіх вырабаў, а таксама новы кандытарскі стол для вытворчасці прадукцыі са слоенага цеста.

Дырэктар Васіль ПЕНЯЗЬ.

ПРАЦУЕМ СТАБІЛЬНА, РЭНТАБЕЛЬНА

— Наш хлебазавод быў здадзены ў эксплуатацыю 24 лістапада 1960 года і напачатку выпускаў усяго 7,7 тоны хлебабулачных вырабаў у суткі, — з гісторыяй прадпрыемства нас пазнаёміла **вядучы эканаміст Інэса Вітальеўна ГРЫШАНАВА.** — Тады на заводзе працавала 77 чалавек. Сёння сяржняусутачныя аб'ёмы вытворчасці ў нас дасягаюць 22,7-23 тоны. Колькасць работнікаў выраслa да 360 чалавек. Прадпрыемства «пасталела», развілося, «выспела». Пашырыўся асартымент: мы цяпер выпускаем не толькі хлебабулачныя, але і кандытарскія вырабы, сутачныя аб'ёмы вытворчасці якіх складаюць 430 кілаграмаў (гэта каля 11 тон у месяц). У асартымент кандытарскіх вырабаў уваходзяць кексы, рулеты, тарты, пірожныя — рознай вагі, відаў і з рознымі начынкамі, прысмакі «Мучныя», прысмакі «Цукрыстыя», паўфабрыкаты выпечаныя і замарожаныя.

За 10 месяцаў бягучага года прадпрыемствам выпушчана 6700 тон хлебабулачных вырабаў, 2400 тон булачнай прадукцыі (якая ўключае вырабы з мукі вышэйшага гатунку, здобныя булачкі, пірагі, пончыкі) і 121 тона «кандытаркі». Прадпрыемства штогод асвойвае новыя віды прадукцыі. Сёлета мы працягваем выпуск нашых апошніх навінак — пончыкаў, хлябцоў, сухарыкаў «Ванільных», казінакаў з насення сланечніку. Між іншым, казінакі выдатна канкуруюць з аналагічным украінскім і расійскім прадуктам. Сёлета за 10 месяцаў мы выпусцілі 4 тоны казінакаў, 37 тон пончыкаў, 43 тоны сухароў.

З 2006 года на Салігорскім хлебазаводзе ўкаранёная сістэма менеджменту якасці СТБ ІСО 9001-2001.

У гэтым годзе ў нас адбылося пашырэнне і тэхнічнае пераабсталяванне кандытарскага ўчастка. Гэтым мы заклалі базу для пашырэння асартыментнага пераліку кандытарскай прадукцыі за кошт вырабаў са слаёнага цеста, пячэння, пернікаў з начынкамі. Мы і надалей працягнем павялічваць асартымент «кандытаркі». Карыстаецца попытам наша прадукцыя лячэбна-прафілактычнага харчавання. За 10 месяцаў бягучага года мы выпусцілі 1600 тон дыетычнай прадукцыі і 110 тон дыябетычных вырабаў.

25 працэнтаў у агульным аб'ёме хлеба-булачных вырабаў у нас складае ўпакаваная прадукцыя, у тым ліку 14 працэнтаў — нарэзаная. Гэты асартымент карыстаецца стабільным попытам. Мы працуем над павелічэннем аб'ёмаў запакаванай прадукцыі, бо хлеб усё ж — харчовы прадукт, і ён, безумоўна, павінен быць запакаваны.

Наша прадпрыемства адпраўляе прадукцыю на экспарт (у асноўным на Смаленшчыну). Сёлета выручка ад рэалізацыі прадукцыі на экспарт склала каля 12 тысяч долараў. Працягваем пошукі дадатковых рынкаў збыту. Заваёўваем спажыўца новым асартыментам — казінакамі, сухарыкамі «Ванільнымі», кандытарскімі вырабамі. Беларуская прадукцыя выгадна адрозніваецца ад расійскай большай натуральнасцю.

Гандлюем мы як праз арганізацыі горада і раёна, так і праз сваю фірменную сетку (гэта фірменны магазін «Водар хлеба» ў Салігорску, два гандлёвыя павільёны, кіёск, аўтакрама). Выязны гандаль ажыццяўляем не толькі па тэрыторыі свайго раёна, але і суседніх.

Наша прадпрыемства працуе стабільна, рэнтабельна, мае сродкі як на тэхнічнае развіццё, так і на сацыяльныя праграмы, прадугледжаныя калектыўным дагаворам.

ТУТ ЁСЦЬ ЧАМУ ПАВУЧЫЦЦА

Салігорскі хлебазавод заўсёды быў на высокім тэхнічным узроўні, а з 2007 года мадэрнізацыя вытворчасці на прадпрыемстве пачала ажыццяўляцца асабліва актыўна. За апошнія тры гады ў плане тэхнічнага пераабсталявання хлебазавод значна змяніўся. Усе, хто быў тут раней, канстатуюць відавочную розніцу. Адміністрацыя завода робіць упор на аўтаматызацыю, па магчымасці выключае з вытворчага працэсу ручную працу. Яшчэ пяць гадоў таму пры выпяканні батонаў

• «Тэмпература апары — вельмі важны паказчык», — зазначыла інжынер-тэхнолаг Вольга КРАВЕЦ.
• Новае высокапрадукцыйнае абсталяванне замешвае цеста розных відаў згодна з зададзенай праграмай.

ДОШКА ГОНАРУ

З нагоды прафесійнага свята адміністрацыя завода ВЫКАЗВАЕ ПАДЗЯКУ СВАІМ РАБОТНІКАМ:

намесніку галоўнага інжынера Мікалаю Мікалаевічу Усовічу, вядучаму эканамісту Інэсе Вітальеўне Грышанавай, кандытару Валянціне Міхайлаўне Чэркас, цеставоду Іне Анатольеўне Казырыцкай, прыбіральшчыцы памяшканняў Ніне Канстанцінаўне Адарыч, прадаўцу Наталлі Аркадзьеўне Пратасюк, вадзіцелю Сяргею Канстанцінавічу Ермаковічу, інжынеру-тэхнолагу Таццяне Уладзіміраўне Ільюшчыц, прыёмшчыку-здатчыку Валянціне Анатольеўне Лемеш.

Якасць вырабаў салігорскіх хлебапёкаў пацверджана асобным сертыфікатам і шматлікімі дыпломамі выставак. Гэтая высокая якасць залежыць ад працы кожнага члена калектыву. Інжынер-мікрабіёлаг Святлана СЯЧКО, упакоўшчыцы гатовай прадукцыі Людміла ВЯРОЎКА, Юлія КАЗЛОЎСКАЯ, Анастасія КЛЮТЧЭНЯ робяць свой уклад у агульную справу.

ПОРУЧ З НАВУКАЙ

...Вытворчая база завода знаходзіцца на годным узроўні, таму рэспубліканскае прадпрыемства «Белтэхнахлеб» «абкатвае» тут свае апошнія распрацоўкі. Падрабязней пра гэта нам расказала **вядучы спецыяліст дзяржаўнага прадпрыемства «Белтэхнахлеб» Алена Сяргееўна КАСЦЮКЕВІЧ:**

— У рамках галіновай навукова-тэхнічнай праграмы «Прадукты харчавання для людзей сталага ўзросту» мы распрацоўваем тэхналогію, на базе Салігорскага хлебазавода асвойваем вытворчасць кампазітных сумесяў для хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў і прадукцыі прафілактычнага і аздараўленчага дзеяння для асобаў сталага ўзросту. Першая прамысловая партыя новай прадукцыі паступіць у продаж у наступным годзе. Гэта хлеб «Карысны ўзбагачаны», сухары «Карысныя», рагалік «Карысны», прысмакі мучныя «Вінаградныя» і пернікі «Пажыўныя», узбагачаныя флаваноідамі, кіслатой і жалезам неаднойчы заваёўвалі вышэйшыя ўзнагароды на прафесійных конкурсах якасці. Ёсць у нас прадукты, узбагачаныя селенам.

Для тых, хто непакоіцца з-за лішняй вагі і імкнецца заўсёды быць у выдатнай форме, мы выпускаем хлябы з вотруб'ем (тыя ж «Агеньчык», «Вітамінка», хлеб «Лідскі дыябетычны», батон «Гасцінец», хлябец «Бадзёрасць» з пшанічнай крупкай і інш.) Ёсць у нас бялковыя хлябы з клейкавінай, фруктозай і паніжаным утрыманнем крухмалу, якія таксама падыходзяць для дыетычнага харчавання (напрыклад, хлябец «Бялковы»).

Мы робім упор на здаровае харчаванне, на абагачэнне хлебабулачных вырабаў, каб зрабіць прадукцыю максімальна карыснай, паўнавартаснай і натуральнай.

Намеснік дырэктара Святлана НОВІК пазнаёміла нас з прыгожымі інтэр'ерамі адноўленага прадпрыемства.

ЗРАБІЦЬ ПРАДУКЦЫЮ МАКСІМАЛЬНА КАРЫСНАЙ І НАТУРАЛЬНАЙ

Начальнік вытворча-тэхналагічнай лабараторыі Валянціна Уладзіміраўна ДЗЕГЦЯРЭВІЧ працуе на заводзе з 1983 года. Яна адна з самых вопытных работнікаў, «ветэранаў» прадпрыемства. Валянціна Уладзіміраўна падзялілася з намі сваімі назіраннямі за работай роднага завода.

— Наш хлебазавод змяніўся карэнным чынам: з'явіліся новыя печы, новыя тэхналагічныя лініі, палепшыліся ўмовы працы, ды і чыста вонкава — у эстэтычным плане — завод сёння зусім не той, якім ён быў, калі я толькі прыйшла сюды.

Значна пашырыўся асартымент: у суткі мы выпускаем каля 40 відаў хлебабулачных вырабаў і 50 кандытарскіх. Штогод праводзім абнаўленне, шукаем новыя рэцэптуры. Напрыклад, дзякуючы новай лініі па раздзелцы слоенага цеста, мы зможам значна абагаціць наш асартыментны пералік рознымі відамі слоеных вырабаў. Ужо сёння на паліцах Салігоршчыны з'явіліся нашы прысмакі «Рэчыцкія». У бліжэйшы час асвоім выраб палачак слоеных, штрудзеляў, круасанаў, у наступным годзе парадуем спажыўцоў нашым новым пячэннем і пернікамі з начынкай. Мы ніколі не спыняемся на тым, чаго ўжо дасягнулі.

Пасля пуску чэшскай печы для вырабу батонаў мы змаглі ўдасканаліць вытворчы працэс, сталі мясіць цеста на вялікіх густых апарах, дзякуючы чаму прадукцыя цяпер атрымліваецца больш пышнай, высокай, з лепшай порыстасцю і ярчэйшым водарам. Натуральна, спажывец не мог гэтага не ацаніць. Замена печы па вытворчасці подавых хлябоў таксама станоўча адбілася на якасці хлябоў і дазволіла эканоміць электраэнергію.

Наш завод адзін з лідараў у краіне па выпуску ўзбагачанай хлебабулачнай прадукцыі. Яе якасць высока ацанілі не толькі спажыўцы, але і спецыялісты (напрыклад, наш хлеб «Арэса», хлеб «Краснасельскі» і хлябец грэцкі «Вітамінізаваны» на Рэспубліканскім аглядзе якасці хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў «Ласунак-2010» атрымалі залатыя медалі). Мы цесна супрацоўнічаем з беларускай навукай, у прыватнасці, з інавацыйным навукова-вытворчым прадпрыемствам «Унітэхпрам БДУ», якое выпускае шмат натуральных вітамінна-мінеральных дабавак, а мы ўзбагачаем імі свае хлябы. Наш хлябец «Агеньчык», хлябец «Вітамінка» з вітамінамі групы В, фоліевай селенам, кальцыем і вітамінамі групы В. Яны ўмацоўваюць сардэчна-сасудзістую сістэму, спрыяюць паляпшэнню фізічнага стану і падаўжэнню актыўнага ладу жыцця людзей сталага ўзросту.

Раней — зноў жа на базе Салігорскага хлебазавода — мы ўкаранялі прадукты для спартсменаў, узбагачаныя фоліевай кіслатой і вітамінамі групы В. Гэта аснова здаровага харчавання — дыетычныя і ўзбагачаныя вырабы.

УЗНАГАРОДЫ

Прадпрыемства актыўна ўдзельнічае ў спецыялізаваных выставах і конкурсах як рэспубліканскага, так і міжнароднага ўзроўню.

У 2004 годзе на спецыялізаванай выставе ў Ніжнім Ноўгарадзе хлеб «Брыз» Салігорскага хлебазавода заваяваў залаты медаль. У 2005-м багет «Салігорскі новы» стаў лаўрэатам конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь». На Міжнароднай спецыялізаванай выставе «Хлеб-2007» у Кіеве хлябец «Агеньчык» атрымаў сярэбраны медаль, а булачка «Салігорская дыетычная» — бронзавы. У той жа год на Рэспубліканскім аглядзе якасці хлебабулачных вырабаў былі адзначаны адразу пяць відаў прадукцыі салігорскіх хлебапёкаў: хлеб «Пажыўны з кменам», хлеб тоставы «Зорачка» і багет «Салігорскі новы» — золатам, хлеб «Вызненскі з кропам» і хлеб «Вызненскі заварны» — серабром. На Рэспубліканскім аглядзе якасці кандытарскіх вырабаў «Ласунак-2008» яшчэ пяць прадуктаў атрымалі высокую ацэнку журы і залатыя медалі і дыпломы: ласунак мучны «Марцыпанавая каса», кекс «Фісташкавы», ласунак мучны «Пахлава Салігорская», рулет «Яблычны бісквітны», рулет «Салігорскі дыябетычны». Летась на аналагічным конкурсе-аглядзе «Ласунак-2009» тарты «Жанет» і «Графскія развалiны» прынеслі Салігорскаму хлебазаводу золата, торт «Салігорскі» — серабро.

НАШЫ ГРАМАДСКІЯ АБ'ЯДНАННІ

— На заводзе дзейнічаюць розныя грамадскія фарміраванні: прафсаюз, жансавет, БРСМ, камісія па выкананні працоўнай дысцыпліны і барацьбе з п'янствам на вытворчасці, камісія па садзейнічанні сям'і і школе, грамадскі Савет па справах моладзі, — патлумачыла **намеснік дырэктара Святлана Генадзьеўна НОВІК.** — Прафсаюзную арганізацыю, куды ўваходзяць усе работнікі завода, узначальвае начальнік лабараторыі Валянціна Дзегцярэвіч. Прафкам сумесна з адміністрацыяй прадпрыемства правядзіць сур'ёзную работу па маральным і матэрыяльным стымуляванні работнікаў, ладзіць мерапрыемствы з нагоды календарных і прафесійных святаў, арганізуе спартакіяды, аказвае матэрыяльную падтрымку ў выпадку сумных падзей у сем'ях работнікаў, на віншаванне юбіляраў завода і г.д. Ужо 10 гадоў на прадпрыемстве дзейнічае група здароўя. Два разы на тыдзень работнікі хлебазавода наведваюць басейн, абанементы аплачвае прафкам.

Савет жанчын, які налічвае 229 удзельніц, узначальвае майстар па рэалізацыі гатовай прадукцыі Аліна Аляксандраўна Глазкова. У першую чаргу гэтая арганізацыя надае вялікую ўвагу побыту і ўмовам працы работніц. Па прапанове жансавета былі адрамантаваны душавыя, раздзявальні, набыты новыя шафы для посуду, сталы, лаўкі. Клапоціцца арганізацыя пра здароўе сваіх жанчын. На прадпрыемстве рэгулярна праводзіцца профілактыка грыпу і ВРЗ, медагляды і медыцынскія лекцыі.

На Салігорскім хлебазаводзе добрасумленна адпрацавалі і цяпер сышлі на заслужаны адпачынак ветэраны Вялікай Айчыннай вайны: Ганна Сямёнаўна Даброва, Ульяна Аляксееўна Кацько, Ірына Арцёмаўна Капыценка, Вольга Андрэеўна Бялькевіч. Адміністрацыя прадпрыемства і прафсаюзны камітэт пастаянна аказваюць ім матэрыяльную і маральную падтрымку. Да 9 мая і 3 ліпеня выдаткоўваюць матэрыяльную дапамогу, часта ладзяць чаяванні з кіраўнікамі і членамі прафсаюза, віншуюць з днямі нараджэння.

Работнікі, якія адпрацавалі ў нас 15 гадоў і больш, у адпаведнасці з калектыўным дагаворам пачаша нашымі ветэранамі працы. Сёння такіх у нас 75 чалавек. Для ветэранаў-пенсіянераў адміністрацыя завода і прафкам ладзяць у дэгустацыйнай зале салодкія сталы, не забываюцца павіншаваць з прафесійнымі і каляндарнымі святамі, матэрыяльна падтрымаць у Сусветны дзень інвалідаў і ў Дзень сталага чалавека.

ЗАМЕСТ ЗАКЛЮЧЭННЯ

— Віншую свой калектыў з юбілеем нашага прадпрыемства, — сказаў напрыканцы сустрэчы дырэктар прадпрыемства Васіль Паўлавіч ПЕНЯЗЬ, — жадаю ўсім здароўя, дабрабыту, усяго самага найлепшага. І — карыстаючыся магчымасцю — напярэдадні прафесійнага свята хачу павіншаваць усіх работнікаў сельскай гаспадаркі. Нізкі вам паклон і наша шчырая ўдзячнасць за такую нялёгкую і такую важную справу — расціць хлеб.

• Вядучы спецыяліст РУП «Белтэхнахлеб» Алена КАСЦЮКЕВІЧ, цестамес Юлія СЯЧКО, інжынер-тэхнолаг Наталля ДАВЫДАВА за распрацоўкай новых вырабаў.
• Аляксандр ЕРАШЭВІЧ працуе на хлебазаводзе слесарам кантрольна-вымяральных прыбораў і аўтаматыкі.

ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА
Рэспубліканскае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Барысаўхлебпрам» філіял «Салігорскі хлебазавод»
223710, Мінская вобл., г. Салігорск, пр-т Міру, 36.
Тэл.: 80174 25 43 40, 25 05 59.
УНП 600142719.

Інга МІНДАЛЁВА, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31.
http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 5595. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12